WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
27 ЛЮТАГА 2010 г. СУБОТА № 37 (26645)
Кошт 650 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.


Фота БЕЛТА.



Аляксей ГРЫШЫН, алімпійскі чэмпіён-2010 у фрыстайле:

# «У ПАЕЗДКУ НА АЛІМПІЯДУ Я АТРЫМАЎ ШМАТ ЗАКАЗАЎ. ГАЛОЎНЫ З ІХ — ЗАВАЯВАЦЬ АЛІМПІЙСКАЕ «ЗОЛАТА» — Я ЎЖО ВЫКАНАЎ»

**Пасля таго, як на вялікім табло мястэчка Кіпрыс Мантаін высвецілася, што Аляксей Грышын становіцца пераможцам, жыццё яго адразу крута змянілася. Спатрэбілася амаль гадзіна, каб адарваць героя Ванкуверскай Алімпіяды ад шматлікіх замежных інфармацыйных агенцтваў і валанцёраў.**

*І вось ён, спакойны і задаволены, гатовы адказваць на пытанні.*

**— Аляксей, якія пачуцці на душы пасля абвяшчання цябе першым алімпійскім чэмпіёнам-зімнікам у Беларусі?**

— Душа спяваць просіцца. Хоць я яшчэ не адчуў, што на мяне навалілася слава ўладальніка залатога алімпійскага медаля.

**— Скажы шчыра: ты верыў, што праз цэлых восем гадоў, пасля бронзавага поспеху на Алімпійскіх гульнях-2002 у амерыканскім Солт-Лейк-Сіці, да цябе прыйдзе гэты поспех?**

— А як жа без веры?! Мае бацькі, жонка Ірына, знаёмыя і блізкія таксама ў гэта верылі і давалі мне дадатковую ўпэўненасць, што трэба трэніравацца, удасканальваць сябе, імкнуцца да найвышэйшай прыступкі п'едэстала.

**— З роднымі і блізкімі ўсё зразумела — хто ж з іх кепскага пажадае?! А вось як быць з супернікамі і суддзямі?**

— Наконт судзейскага фактара заўсёды шмат размоў ходзіць. Кагосьці засуджваюць, кагосьці — не. Лічу, што сёння судзейства было нармальным. І не толькі таму, што мяне не «зарэзалі». Арбітры ўсіх, асабліва ў першай спробе, крышку прытрымлівалі...

**— ...пакідаючы пры гэтым сімпатыі на баку кітайскіх, амерыканскіх і канадскіх фрыстайлістаў?**

— Не без гэтага. Хоць на агульную раскладку спаборніцтваў гэта не паўплывала.

**— Аляксей, ты выконваў другі скачок перадапошнім у спісе 12. Каб разлічваць на чэмпіёнства ці месца на п'едэстале, неабходна было ўскладніць праграму — заказаць і бездакорна выканаць двайны піруэт з трэцім сальта.**

— Ведаеце, у нашым відзе спорту — гэта звычайны крок. Рызыка тут якраз да месца. Галоўнае, каб пасля двух вінтоў ты змог правільна здзейсніць пасадку і выехаць на фініш без агрэхаў. Сёння ў мяне гэта атрымалася.

**— Твой фенаменальны палёт і пасадка зрабілі суддзяў падатлівымі — яны аддалі табе першае месца. Праўда, апошнім выконваў скачок канадзец Кіл Нісен. Ён мог цябе змясціць рангам ніжэй?**

— Мог, безумоўна. Зрэшты, я Кіла добра ведаю, мы неаднаразова перасякаліся на спаборніцтвах. Ён пастаянна знаходзіцца ў лідарах этапаў Кубка свету. Але ж калі на вялікім табло ў відэапаўторы я ўбачыў, як канадзец сагнуў ногі — а гэта значная памылка, за якую здымаюцца балы, то зразумеў: я застануся першым.

**— Трэба меркаваць, што сваіх калегаў па алімпійскім п'едэстале — амерыканца Джэрата Петарсана і кітайца Ліу Чончнгчынга ты таксама ведаеш не па чутках?**

— Вы маеце рацыю. На прафесійнай ніве сустракаемся на чэмпіянатах і этапах Кубка свету. Амерыканец, напрыклад, пастаянна быў у прызавых у мінулым сезоне, стаўшы пераможцам этапа Кубка свету ў сябе на радзіме — у Лэйк-Плэсідзе, а кітаец сёлета ў родным Чанчунгу стаў сярэбраным прызёрам на аналагічным турніры.

**— Супернікі, што называецца, палец у рот не кладзі — адкусяць?**

— У любым відзе спорту існуе канкурэнцыя, барацьба. Дзякуючы гэтаму, можна сказаць, наша дысцыпліна ўдасканальваецца. Праўда, паміж спартсменамі, незалежна ад сітуацыі, заўсёды захоўваюцца цёплыя дружалюбныя адносіны.

**— Аляксей, а няўдачы тваіх калегаў па цэху — Антона Кушніра ў кваліфікацыі і Дзмітрыя Дашчынскага ў першым фінальным скачку — не здольны былі псіхалагічна цябе выбіць з прывычнай каляі?**

— Калі я выступаю на спаборніцтвах такога ўзроўню, як Алімпіяды, то мае погляды і думкі скіраваныя толькі на бездакорнае выкананне ўласных скачкоў, да якіх я рыхтаваўся праз пот і кроў. Калі буду сачыць за кожным з маіх калегаў ці супернікаў і зрывацца ў душы, то грош цана будзе майму выступленню. Я проста не змагу сабрацца на скачок.

**— Сённяшні твой залаты поспех у Ванкуверы — гэта ўжо здабытак гісторыі. У цябе ёсць мары застацца ў спісе алімпійцаў як мінімум да сочынскай Алімпіяды 2014?**

— Пакуль адназначна сказаць не магу. Пагляджу, як будзе са здароўем, ці змагу паўнацэнна залячыць свае спінныя грыжы. Калі медыцына скажа, што пагаршэнняў са спінай не будзе, то чаму б і не.

**— Сапраўды, фрыстайл — прафесія гераічная. Вунь Ала Цупер днём раней выконвала складанейшыя піруэты з пашкоджанай лапаткай.**

— Я здымаю капялюш перад Алай Цупер, якая змагла пераадолець сябе і з такой траўмай паказаць прыстойны вынік у фінале. Нізкі паклон таксама Асоль Слівец, якая да апошняга змагалася з тытулаванымі суперніцамі. Можна сказаць, што яны падштурхнулі нас на подзвігі.

**— Зразумела, што да заканчэння Алімпіяды ў цябе з'явіўся вольны час. Як збіраешся ім распарадзіцца?**

— Сапраўды, да адлёту дамоў яшчэ некалькі дзён. Калі будзе магчымасць, то абавязкова схаджу на хакей. Увогуле, у мяне вельмі шмат заказаў з дому на пакупку рознай драбязы, сувеніраў.

**— Справішся без дапамогі блізкіх?**

— Калі што, па тэлефоне падкарэктуюць мяне і накіруюць у правільнае рэчышча. Але ж галоўны заказ — заваяваць залаты алімпійскі медаль — я ужо выканаў.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

## Прэзідэнт Беларусі павіншаваў Аляксея Грышына з золатам Алімпіяды

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта павіншаваў алімпійскага чэмпіёна Аляксея Грышына і трэнераў беларускай алімпійскай каманды па фрыстайле з заваяваннем першага залатога медаля за ўсю гісторыю ўдзелу суверэннай Беларусі ў зімовых алімпіядах.

«Мы ганарымся табой. Ты з гонарам вытрымаў самы адказны спартыўны экзамен, праявіў найвышэйшае майстэрства і талент», — гаворыцца ў віншаванні Аляксею Грышыну.

У спаборніцтвах па лыжнай акрабатыцы Аляксей Грышын па суме дзвюх спробаў паказаў лепшы вынік — 248,41 бала (120,58+127,83).

**Прэс служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Спецкар «Звязды» перадае з Ванкувера

Мікалай КАЗЕКА, галоўны трэнер па фрыстайле:

# «Я ВЕРЫЎ, ШТО Ў НАС БУДЗЕ АЛІМПІЙСКІ МЕДАЛЬ... А ЦЯПЕР, АЛЯКСЕЙ, МОЖНА І ПА ЧАРЦЫ!»


Фота БЕЛТА.

**Галоўны трэнер беларускай зборнай па фрыстайле Мікалай Казека на працягу ўсіх скачкоў з удзелам беларускіх фрыстайлістаў быў у цэнтры на вялікім тэлевізійным маніторы. Што ні скачок — то мора эмоцый, перажыванняў, радасці...**

Пасля залатога фінішу Аляксея Грышына яго настаўнік яшчэ доўга не мог выбрацца са стадыёна — трапіў у шчыльнае кола калегаў з іншых дзяржаў, замежных інфармацыйных агенцтваў. Праўда, незаўважаным ад нашага журналісцкага вока яму пайсці не ўдалося.

**— Мікалай Іванавіч, якімі былі першыя словы Аляксею пасля аб'яўлення яго пераможцам?**

— Лічыце, што гэта не для друку. Я яму кажу: «А цяпер, Аляксей, можна і па чарцы». Увогуле, я верыў з самага пачатку ў алімпійскі медаль, у Лёшу, як і ва ўсіх сваіх выхаванцаў. Так, шкада, што датэрмінова выбыў з барацьбы Антон Кушнір і не пашанцавала ў фінале Дзіме Дашчынскаму. Але ж гэта спорт, і тут усялякае здараецца.

**— Гісторыя выступлення беларускіх фрыстайлістаў ведае нямала фактаў, калі ў ход барацьбы ўмешваліся суддзі. На гэты раз Бог мілаваў?**

— Судзейскі фактар — рэч непрыемная і падчас брудная. Але ж на гэты раз, калі сімпатыі да кітайцаў, амерыканцаў і канадцаў былі, то ў разумных межах. Арбітры — таксама жывыя людзі. І хто з іх рызыкне «рэзаць па-жывому», калі на вялікім тэлевізійным экране скачок таго ж Грышына бачылі тысячы гледачоў, што сабраліся ў Кіпрыс Мантайне. Наўрад ці. Ды і Аляксей, што мне вельмі прыемна адзначыць, выканаў абодва практыкаванні бездакорна. Апошні скачок быў настолькі віртуозным, што падчас прызямлення ў мяне душа ў пяткі сышла. Выканаць практыкаванне такой складанасці без памаркі вельмі складана. Але ж Аляксей Грышын з двайным піруэтам з трэцім сальта справіўся на выдатна.

**— Усе карты мог зблытаць канадзец Кіл Нісен, які завяршаў фінальную праграму?**

— Мог, ды не змог. Я вельмі добра ведаю канадскіх хлопцаў-фрыстайлістаў. Нервы ў іх не жалезныя. Адчуваў, што такога напружання яны не вытрымаюць і не праліччыўся. Нашы ж беларускія хлопцы маральна больш загартаваныя. І гэта аб'ектыўная рэальнасць. Выйграць для беларусаў на такіх спаборніцтвах — значыць быць на галаву мацнейшым. А без дадатковай загартоўкі зрабіць гэта проста немагчыма.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

Ірына ГРЫШЫНА:

# «ПЕРАД АЛІМПІЯДАЙ ЛЁША КАЗАЎ, ШТО ЁН У ШЫКОЎНАЙ ФІЗІЧНАЙ ФОРМЕ»

***Перамога Аляксея Грышына на спаборніцтвах па фрыстайле, здаецца, нікога не пакінула абыякавай. Цяпер і ў нас ёсць першы Алімпійскі чэмпіён на зімовай Алімпіядзе! Мы патэлефанавалі жонцы Аляксея Ірыне і распыталі, як яна падтрымлівала мужа, якому перад Гульнямі некаторыя «добразычліўцы» нават раілі пакінуць спорт.***



**— Ірына, віншуем вас!**

— Вялікі дзякуй! Сёння ў мяне не змаўкае тэлефон. Я ўсю ноч не спала — перад спаборніцтвамі не магла заснуць, да мяне прыехала сяброўка. І мы разам глядзелі прамы эфір. А потым, зразумела, было ўжо не да сну.

**— Вы самі патэлефанавалі мужу, каб павіншаваць з «золатам»?**

— Калі ў Лёшы з'явілася магчымасць пасля спаборніцтваў, ён сам набраў мяне. Зараз у галаве такі сумбур, але мне здаецца, ён толькі паспеў сказаць: «Прывітанне, малышка!» Далей гаварыла я.

**— Лёша ў адным з інтэрв'ю прызнаўся, што некаторыя ў яго нават пыталі: ці не надышоў час заканчваць спартыўную кар'еру?..**

— Было шмат размоў, намёкаў. Маўляў, каму ты што хочаш даказаць, твой час сышоў. Але Лёша настолькі доўга ішоў да свайго залатога медаля! У яго была непрыемная траўма калена, якую ён доўга залечваў, потым яму давялося скінуць 16 кілаграмаў вагі... Ён вытрымаў усе гэтыя непрыемнасці. Лёша па жыцці аптыміст і максімаліст, і сапраўды заслужыў гэты поспех.

**— Перад спаборніцтвамі вы сазвоньваліся? Якія словы вы сказалі Аляксею перад алімпійскім фіналам?**

— Мы заўсёды з ім падтрымліваем сувязь. Калі ён на зборах і часавы пояс зусім розны, мы ўсё роўна тэлефануем адно аднаму. Цяпер таксама па максімуме імкнулася яго настроіць. Праўда, у мяне была нейкая ўнутраная ўпэўненасць, што ўсё будзе добра. Я ж бачыла, як ён рыхтаваўся. Лёша сам перад Алімпіядай казаў, што ён у шыкоўнай форме. У яго быў падрыхтаваны вельмі складаны скачок, які ён яшчэ ніколі не выконваў на спаборніцтвах. І калі б давялося рызыкаваць, Лёша быў да гэтага гатовы. Праўда, рызыкаваць не давялося.

**— Як будзеце сустракаць алімпійскага чэмпіёна? Магчыма, рыхтуеце нейкі сюрпрыз?**

— Абавязкова будзе сямейная вячэра — у нас вялікая сям'я, шмат блізкіх. А нашы сябры рыхтуюць для яго сюрпрыз. Праўда, мне пакуль не кажуць, які.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

**НЕАФІЦЫЙНЫ МЕДАЛЬНЫ ЗАЛІК**

| | Краіна | Золата | Серабро | Бронза | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | ЗША | 8 | 12 | 12 | 32 |
| 2. | Германія | 8 | 11 | 7 | 26 |
| 3. | Канада | 8 | 6 | 3 | 17 |
| 4. | Нарвегія | 7 | 6 | 6 | 19 |
| 5. | Паўднёвая Карэя | 6 | 4 | 1 | 11 |
| 6. | Швейцарыя | 6 | 0 | 2 | 8 |
| 7. | Аўстрыя | 4 | 3 | 5 | 12 |
| 8. | Кітай | 4 | 2 | 3 | 9 |
| 9. | Швецыя | 4 | 2 | 2 | 8 |
| 10. | Расія | 3 | 4 | 6 | 13 |
| 11. | Нідэрланды | 3 | 1 | 2 | 6 |
| 12. | Францыя | 2 | 3 | 5 | 10 |
| 13. | Аўстралія | 2 | 1 | 0 | 3 |
| 14. | Чэхія | 2 | 0 | 3 | 5 |
| **15.** | **БЕЛАРУСЬ** | **1** | **1** | **1** | **3** |
| — | Славакія | 1 | 1 | 1 | 3 |
| 17. | Вялікабрытанія | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 18. | Польшча | 0 | 3 | 1 | 4 |
| 19. | Японія | 0 | 2 | 2 | 4 |
| 20. | Славенія | 0 | 2 | 1 | 3 |
| 21. | Латвія | 0 | 2 | 0 | 2 |
| 22. | Італія | 0 | 1 | 3 | 4 |
| 23. | Фінляндыя | 0 | 1 | 2 | 3 |
| 24. | Харватыя | 0 | 1 | 1 | 2 |
| 24. | Казахстан | 0 | 1 | 0 | 1 |
| — | Эстонія | 0 | 1 | 0 | 1 |

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЗША АБЯЦАЮЦЬ АБАРАНІЦЬ КРАІНЫ БАЛТЫІ АД УПЛЫВУ РАСІІ



**ЗША не маюць намеру мірыцца з магчымым пашырэннем уплыву Расіі ў краінах Балтыі. Пра гэта заявіла намеснік кіраўніка Пентагона па міжнароднай палітыцы Мішэль Флурной.**

«Адно з найважнейшых пытанняў, якое неабходна абгаварыць Савету Расія — НАТА, гэта азначэнне таго, што ёсць для нас паняцце «бяспека», — сказала прадстаўнік амерыканскага ваеннага ведамства на прэс-канферэнцыі ў пятніцу ў Таліне. Паводле слоў Флурной, «тут у асобных краін—членаў НАТА і Масквы ёсць пэўнае разыходжанне ў поглядах».

Яна выказала меркаванне, што «нягледзячы на імкненне НАТА супрацоўнічаць з Расіяй, Альянс не мае намеру мірыцца з імкненнем РФ павялічыць свой уплыў у краінах Балтыі». Намеснік міністра запэўніла балтыйскія дзяржавы, што Злучаныя Штаты «верныя па стаўленні да сваіх саюзнікаў і з усёй сур'ёзнасцю ставяцца да ўзятых на сябе абавязкаў».

### ХАКЕРЫ АБВІНАВАЦІЛІ ЛАТВІЮ Ў СУВЯЗЯХ З САМАЛІЙСКІМІ ПІРАТАМІ

**Члены латвійскай патрыятычнай арганізацыі «Народнае войска чацвёртай Атмоды (чацвёртага абуджэння)» апублікавалі ў інтэрнэце дакументы, у якіх гаворыцца аб сувязях латвійскага ўрада з самалійскімі піратамі. Пра гэта піша Тэлеграф.lv са спасылкай на запіс у блогу арганізацыі.**

Паводле звестак, якія апублікавалі хакеры, Латвія прадавала злачынцам зброю, нягледзячы на тое, што ў 1992 годзе Савет бяспекі ААН прыняў рашэнне ўвесці эмбарга на пастаўку зброі і ваеннай тэхнікі ў Самалі ў сувязі з нестабільным становішчам у гэтай краіне. Афіцыйнага пацвярджэння гэтая інфармацыя пакуль не атрымала.

### БУНДЭСТАГ ПАДОЎЖЫЎ МІСІЮ НЯМЕЦКІХ ВОЙСКАЎ У АФГАНІСТАНЕ.
НЯЗГОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ ВЫГНАЛІ

**Германія ўхваліла далейшы ўдзел сваіх войскаў у аперацыях НАТА ў Афганістане. На пасяджэнні бундэстага ў пятніцу за падаўжэнне місіі на год прагаласавалі 429 дэпутатаў, супраць выказаліся 111. Яшчэ 46 дэпутатаў устрымаліся.**

Перад галасаваннем спікер Норберт Ламерт адхіліў ад удзелу ў галасаванні фракцыю «Левых» за парушэнне парадку. Дэпутаты гэтай фракцыі, якія выступаюць за вывад нямецкіх войскаў, падчас пасяджэння ўсталі з месцаў, падняўшы прынесеныя з сабой плакаты. На іх былі напісаныя імёны і ўзрост афганскіх дзяцей, загінулых падчас баявых дзеянняў НАТА. Пасля рашэння спікера яны ў поўным складзе (76 чалавек) пакінулі залу пасяджэнняў. Новы мандат мяркуе павелічэнне колькасці нямецкага кантынгенту ў гэтай краіне з 4500 да 5350 салдатаў.

### ІРАК ВЕРНЕ Ў СТРОЙ БОЛЬШ ЗА 20 ТЫСЯЧ АФІЦЭРАЎ АРМІІ САДАМА ХУСЕЙНА



**Урад Ірака вырашыў вярнуць у армію і аднавіць у пасадах больш за 20 тысяч афіцэраў, якія служылі ў часы кіравання Садама Хусейна, паведамляе The New York Times.**

Прадстаўнік міністэрства абароны Ірака заявіў, што прэм'ер-міністр Нуры аль-Малікі ўхваліў план па вяртанні былых афіцэраў у армію.

## З серады зноў пахаладае

На працягу апошняга тыдня лютага на тэрыторыі Беларусі назіралася сапраўдная адліга, калі сярэднясутачная тэмпература была на 2—8 градусаў вышэй за норму, паведаміла рэдакцыі **галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

У выхадныя ўдзень ад мінус 1 да плюс 6, уначы на нядзелю ад 3 марозу да 2 цяпла. У панядзелак чакаецца мокры снег і дождж, а ў аўторак кароткачасовы мокры снег пройдзе на поўначы краіны. Тэмпература ўначы ў першыя два дні наступнага тыдня ад мінус 3 да плюс 3, удзень — 0 — плюс 6 градусаў. У сярэдзіне наступнага тыдня да нас завітае больш халоднае надвор'е з боку Скандынавіі. Пройдзе снег. Тэмпература ў сераду на працягу сутак ад мінус 5 да 2 цяпла, уначы пры праясненнях — да 7 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### НАВАР З БУЛЬБЫ

6,5 мільёна рублёў у асабістую кішэню выручыла спецыяліст КСУП «Ураджайны», што ў Лоеўскім раёне. 21 тону бульбы, адпушчаную з гаспадаркі ў Лоеўскае райпа, 49-гадовая грамадзянка афарміла як закупленую ў жыхароў вёскі Убарок. Выручаныя грошы жанчына прысвоіла, а бульба была спісана на корм жывёле.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Памер усіх відаў стыпендый у Беларусі павялічаны на 5 працэнтаў

**Памер усіх відаў дзяржаўных стыпендый навучэнскай моладзі ў Беларусі з 1 студзеня 2010 года павялічаны на 5 працэнтаў. Указ аб гэтым № 90 Прэзідэнт Беларусі падпісаў 26 лютага.**

Так, памер стыпендый для студэнтаў ВНУ складзе ад Br102,5 тыс. да Br164,1 тыс., для навучэнцаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, -- ад Br86,1 тыс. да Br137,6 тыс.

Як адзначылі ў прэс-службе, указ прыняты ў мэтах далейшага ўзмацнення сацыяльнай абароны навучэнскай моладзі.

## Стыпендыі студэнтам і навучэнцам — будучым атамшчыкам павялічаны ў Беларусі на 10 працэнтаў

**У Беларусі з 1 студзеня 2010 года павялічаны на 10 працэнтаў памер вучэбных стыпендый студэнтам і навучэнцам, якія вучацца па спецыяльнасцях у атамнай энергетыцы. Адпаведны ўказ № 89 Прэзідэнт Беларусі падпісаў 26 лютага.**

У прыватнасці, павелічэнне стыпендый закране тых, хто вучыцца па спецыяльнасцях: ядзерная фізіка і тэхналогіі, радыяцыйная хімія, радыяхімія, электронныя сістэмы кантролю і кіравання на атамных электрастанцыях, паратурбінныя ўстаноўкі атамных электрастанцый, будаўніцтва цеплавых і атамных электрастанцый, ядзерная і радыяцыйная бяспека.

Гэта мера накіравана на павышэнне зацікаўленасці моладзі ў атрыманні гэтых складаных, звязаных з пэўнай рызыкай, але вельмі неабходных дзяржаве спецыяльнасцяў, растлумачылі ў прэс-службе.

Указам таксама павялічана на Br100 тыс. стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Яе памер складзе Br300 тыс., што дасць магчымасць прывесці яе ў адпаведнасць з іншымі відамі дзяржаўных стыпендый навучэнскай моладзі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Бензін зноў падаражэў

З сённяшняга дня розничныя цэны на нафтапрадукты, якія рэалізуюцца праз аўтазаправачныя станцыі, павышаныя ў сярэднім на 7 працэнтаў. Як паведамілі ў вытворчым аб'яднанні «Беларуснафта», цяпер адзін літр бензіну А-76 (Н-80) каштуе 2080 рублёў, за літр бензіну АІ-92 давядзецца заплаціць 2700 рублёў, бензіну АІ-95 — 3050 рублёў, кошт аднаго літра дызельнага паліва вызначаны на ўзроўні 2430 рублёў. Раней, 23 студзеня цэны на АЗС у сярэднім узраслі на 2 працэнты.

**Ігар ГРЫШЫН.**

ВНИМАНИЕ!

ФОНД «ВИТЕБСКОБЛИМУЩЕСТВО»

**сообщает, что аукцион по продаже лотов №№ 2, 3, 4, назначенный на 18.03.2010 года** *(извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.02.2010 года № 25 (26633)),*

**ПЕРЕНОСИТСЯ на 17.03.2010 года.**

**Аукцион состоится 17 марта 2010 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 17.03.2010 до 12.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 17.03.2010 с 14.00 до 14.45.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «АВТОМАГИСТРАЛЬ»
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

с применением метода понижения начальной цены по продаже следующих объектов:

**Лот № 1:** комплекс сервисного обслуживания «Валерьяны», расположенный в д. Валерьяны Узденского района Минской области **в составе зданий:** гостиница с рестораном, об. пл. 1206 кв.м; пункт технического обслуживания автомобилей, об. пл. 242,3 кв.м; здание овощехранилища, об. пл. 156,2 кв.м; здание павильона-клиентской, об. пл. 19,6 кв.м; здание подстанции, об. пл. 54 кв.м; **сооружений:** стоянка для автомобилей, об. пл. 2268,7 кв.м; скважина (артезианская) (2 ед.), водонапорная башня, насосная, очистные сооружения, внутриплощадочные сети; **передаточных устройств и оборудования** (согласно ведомости инвентаризации и оценки основных средств ОАО «Автомагистраль» для дальнейшей продажи на аукционе по состоянию на 01.01.2010). Начальная цена с НДС – 2 028 514 277 бел. руб. **Минимальная цена с НДС** – 405 702 855 бел. руб. Площадь земельного участка 1,7823 га.

**Лот № 2:** здание бытового помещения, об. пл. 188,0 кв.м, расположенное по адресу: Могилевская область, Чаусский район, д. Атражье. Начальная цена с НДС – 10 496 699 бел. руб. **Минимальная цена с НДС** – 2 099 340 бел. руб. Площадь земельного участка 0,6600 га. Задаток в сумме 50 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 15 дней с даты проведения аукциона. Оплата за объект (лот) производится в течение 30 календарных дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Объекты продаются без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **30.03.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.03.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

# ПРЫЁМНЫ ЦЯХЦІН


Валянціна Аляксееўна ФІЛІПАВА і яе дачка Лера сапраўды падобныя.

**У АГРАГАРАДКУ Цяхцін, што ў Бялыніцкім раёне, дзясятак сем'яў выхоўваюць прыёмных дзяцей. У мясцовай школе цяпер вучацца 15 дзяцей, якія сталі роднымі для цяхцінскіх прыёмных бацькоў.**

### З дзецьмі не сумна

На вуліцы Школьнай рад жоўтых катэджаў. Адзін з іх належыць жонцы і мужу Цапікам. Гаспадыня Раіса Іванаўна запрашае ў хату і просіць прабачэння за творчы беспарадак. Маўляў, дзяцей шмат. Нібыта ў пацвярджэнне ў пакой урываецца маленькі хлопчык, бялявы і блакітнавокі, нібыта жвавы анёльчык. Унук Захар не дае бабулі сумаваць, пакуль школьнікі вучацца.

> **По звестках аддзела па ахове правоў дзяцінства ўпраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама, у рэгіёне налічваецца 710 прыёмных сем'яў, дзе выхоўваюцца больш за 1200 дзяцей.**

Школьнікі — гэта 9-гадовая Насця і 11-гадовы Андрэй, малодшыя з чатырох дзяцей, для якіх Цапікі сталі прыёмнымі бацькамі.

— Гэта было ў 2003 годзе: у нашым Цяхціне адна жанчына ўзяла на выхаванне дзяцей, а потым другая. Трэба ж не адстаць, добры прыклад заразлівы, — усміхаецца Раіса Іванаўна. — А калі сур'ёзна, то дзяцей шкада. Іх у прытулку шмат і кожны просіць: «Мама, вазьмі мяне!»

Яна спакойна расказала і пра сваю жыццёвую сітуацыю: пайшла на пенсію, свае дзве дачкі выраслі і з'ехалі. Бацькам сумна: «Як жа мы будзем удваіх? Возьмем дзетак гадаваць, і нам весялей будзе, і дзяржаве дапамога». Раіса Іванаўна паехала ў Магілёў, меркавала ўзяць з прытулку дваіх дзяцей, але атрымалася — адразу чацвёра.

— Прывялі мне маленькую дзяўчынку: «Глядзі, вось твая маці будзе», — узгадвае жанчына. — Яна мне на калені залезла, і я заплакала. Ну як бацькі такіх дзетак маглі кінуць? А тут выходзіць старэйшая дзяўчынка і просіць узяць яшчэ малодшага хлопчыка, каб не разлучаць брата і сястру. Урэшце выявілася, што іх усіх пяцёра. Старэйшы хлопчык быў ужо выпускніком, а астатніх чацвярых я забрала. І не шкадую!

Што ж, цяпер пенсіянерам Цапікам дакладна не сумна. Раіса Іванаўна не можа адысці ад пліты: як толькі заканчваецца снеданне, яна пачынае гатаваць абед, а потым і вячэру. Паміж гатоўкай — мыццё, прыбіранне і рамонт адзення, якое «гарыць» на малых.

Хата не пустуе ніколі. Уся сям'я налічвае 16 чалавек, гэта калі прыязджаюць свае дзеці з унукамі, якія з прыёмнымі зліваюцца ў адну вялікую шумную кампанію. Старэйшыя з тых чатырох дзяцей сёння ўжо жывуць у Магілёве: хлопчык працуе ў аўтапарку, дзяўчынка вучыцца на бухгалтара. Але ўсе яны цягнуцца да прыёмнай маці і вяртаюцца ў Цяхцін дадому.

СТАР. 2

### МАРШРУТКА НЕ САСТУПІЛА

Шэсць магілёўцаў пацярпелі ў выніку сутыкнення маршрутак у Магілёве 26 лютага. Вадзіцель адной з маршрутак быў няўважлівы і не саступіў дарогу калегу. 6 пасажыраў шпіталізаваныя.

**Алена КАЗЛОВА.**

### АБРЫНУЛІСЯ ДАХІ

25 лютага ўвечары ў вёсцы Сакольнічы Крычаўскага раёна адбылося абрушэнне даху жылога дома з-за снежнай нагрузкі і ападкаў. У той жа дзень дахі абрынуліся ў яшчэ двух прыватных пуняў у Быхаўскім і Кіраўскім раёнах. Ніхто не пацярпеў, але служба МНС звяртае ўвагу гаспадароў і кіраўнікоў на неабходнасць пачысціць дахі будынкаў.

**Ул. інф.**

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.02.2010 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 930,00 | 1 чэшская крона | 153,03 |
| 1 еўра | 3 978,06 | 1 польскі злоты | 998,47 |
| 1 латвійскі лат | 5 605,51 | 1 расійскі рубель | 97,54 |
| 1 літоўскі літ | 1 151,48 | 1 украінская грыўня | 367,19 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 30,0388 |
| UAH | 37,6426 |
| 1000 BYR | 10,2487 |
| EUR | 40,7566 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

# АДНОЙ ВАНДРОЎКАЙ У ДВУХ ЗАЙЦОЎ

*Беларуска-славацкае супрацоўніцтва ў галіне турызму цікавае не толькі ў плане бізнэсу, але і міжкультурных кантактаў*

Гандлёвы абарот паміж Славакіяй і Беларуссю летась склаў каля 200 млн долараў. Мы пастаўляем туды калійныя ўгнаенні, халадзільнікі, пліты, вырабы з чорных металаў, медыцынскую апаратуру, тэкстыльныя вырабы, соль і нафтапрадукты. А ўвозім пераважна тэлевізары, маніторы, праектары, запчасткі для аўтатэхнікі і іншае. Узаемадзеянне досыць дынамічнае. Мінулым летам у Браціславе прайшло пасяджэнне сумеснай беларуска-славацкай камісіі па гандлёва-эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. Падпісаная праграма супрацоўніцтва дзяржаў у сферы турызму. І першыя вынікі не прымусяць сябе чакаць — турыстычны патэнцыял і інвестыцыйныя магчымасці абедзвюх краін у гэтай галіне будуць прэзентаваны ў красавіку. Мерапрыемства пройдзе ў беларускай сталіцы пры падтрымцы Славацкага агенцтва па турызме. **Пасол Славакіі ў Беларусі Марыян СЕРВАТКА** высока ацэньвае патэнцыял супрацоўніцтва ў гэтай сферы. Падчас сустрэчы з журналістамі ён адзначыў, што гэта не толькі цікавы бізнэс, але і добрая платформа для міжкультурных кантактаў.

Са свайго боку Славакія заахвочвае беларусаў да вандровак. З 3800 візаў, выдадзеных летась славацкім консульствам, прыкладна трэціна трапіла ў беларускія пашпарты бясплатна. Эканоміць на консульскіх зборах пашчасціла пераважна студэнтам, выкладчыкам, навукоўцам, спартсменам, мастакам і іншым дзеячам сферы культуры. І цалкам верагодна, што пасля красавіцкай прэзентацыі ў палку аматараў Славакіі прыбудзе. Кіраўнік дыпмісіі нагадаў пра перамовы ЕС і Беларусі па спрашчэнні візавага рэжыму. Славацкі бок, у прыватнасці, высока ацэньвае вынікі дзейнасці Беларусі па ахове межаў, барацьбе з арганізаванай злачыннасцю, незаконнай міграцыяй, наркагандлем і гандлем людзьмі.

Мяркуецца завязаць кантакты на ўзроўні нацыянальных інвестыцыйных агенцтваў. Славацкія прадпрыемствы, паводле слоў дыпламата, праяўляюць інтарэс да кантактаў з Беларуссю ў галіне транспарту, сельскай гаспадаркі, будаўніцтва і энергетыкі (у прыватнасці, у рамках рэканструкцыі славацкіх ЦЭЦ). Ёсць таксама зацікаўленасць у стварэнні з Беларускай чыгункай сумеснага прадпрыемства па вытворчасці саставаў і рамонце лакаматываў і вагонаў.

Што да гуманітарных праектаў, то славацкі бок падтрымае ініцыятыву па стварэнні ў Беларусі банка донараў касцявога мозгу.

Усходняе партнёрства, на думку пасла, можа быць для Беларусі вельмі добрай прасторай для канструктыўнага дыялогу, абмену вопытам з краінамі ЕС. Аднак гэта таксама і цудоўная магчымасць для Еўрасаюза атрымаць больш блізкае і глыбокае пазнанне краін, уключаных у ініцыятыву.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**


## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ТЕХНОБАНК»!

Настоящим извещаем о проведении очередного (годового) Общего собрания акционеров ОАО «Технобанк» **в очной форме.**

**Дата проведения: 30 марта 2010 года.**

**Место проведения (адрес): г. Минск, пр. Победителей, д. 31, 2-й этаж (конференц-зал ОАО «Гостиница Планета»).**

**Регистрация участников Общества для участия в собрании: с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.**

**Время проведения заседания: с 11.00 до 14.00.**

**Повестка дня Общего собрания акционеров:**

1. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках и т.д. за 2009 год.
2. О распределении прибыли ОАО «Технобанк» за 2009 год.
3. О нормативах распределения прибыли ОАО «Технобанк» на 2010 год.
4. О выплате дивидендов за 2009 год.
5. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
6. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Технобанк».
7. О внесении изменений и дополнений в локальные нормативные акты ОАО «Технобанк».
8. Об избрании членов Совета Директоров ОАО «Технобанк».
9. Об осуществлении выплат.
10. Об избрании членов Ревизионной комиссии ОАО «Технобанк».
11. О выкупе ОАО «Технобанк» акций собственного выпуска по требованию акционеров ОАО «Технобанк».

**Для регистрации с собой необходимо иметь: паспорт (для физических лиц), документ, подтверждающий полномочия руководителя, и печать (для юридических лиц)!!!**

Для получения дополнительной информации обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу:
**г. Минск, ул. Кропоткина, 44, телефон (017) 237 43 80.**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г., УНП 100706562.


**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне начальніку аддзела бухгалтарскага ўліку Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Сямашка Але Мікалаеўне з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора — смерці МАЦІ.**

Васіль ЖАРКО:

# ПРЫЯРЫТЭТ — ЗА ПЕРШАСНЫМ ЗВЯНОМ?

*Зала калегіі*

**У 2009 годзе ў Беларусі быў адзначаны далейшы рост аб'ёмаў аказання медыцынскай дапамогі. На кожнага жыхара нашай краіны прыпала 13,5 наведвання ўрачоў амбулаторна-паліклінічных арганізацый. У папярэднім годзе гэты паказчык складаў 12,9 на кожнага жыхара. Такім чынам па колькасці наведванняў урачоў мы захоўваем лідзіруючыя пазіцыі ў свеце... Колькасць выездаў брыгад хуткай дапамогі вырасла летась на 4,3 працэнта, а колькасць шпіталізаваных — на 1,2 працэнта (з 27,9 да 28,4 з разліку на 100 жыхароў). Пра гэта паведамілі, падводзячы ў БелМАПА вынікі дзейнасці медыцынскай галіны за 2009 год, міністр аховы здароўя Беларусі Васіль ЖАРКО.**

Быў зафіксаваны таксама нязначны рост занятасці ложкавага фонду — з 312,7 у 2008 годзе да 315,4 дзён у 2009 годзе, што сведчыць аб недастаткова рацыянальным яго выкарыстанні. Лепшыя паказчыкі па занятасці ложкавага фонду маюць Мінск і Гомельская вобласць, а горшыя паказчыкі ў Мінскай вобласці.

— Год таму мной была пастаўлена задача планамернага скарачэння ложкавага фонду і адначасовага ўкаранення стацыянарзамяшчальных тэхналогій як у амбулаторна-паліклінічных, так і ў бальнічных установах. Сёння можна канстатаваць, што гэтая задача вырашаецца: на месцах арганізавана двухзменная работа дзённых стацыянараў ва ўсіх амбулаторна-паліклінічных установах і адкрыты аддзяленні і ложкі дзённага знаходжання ў стацыянарах. Аднак рэгуляванне аб'ёмаў стацыянарнай медыцынскай дапамогі застаецца надзвычай актуальным пытаннем, — падкрэсліў міністр. — Спадзяюся, што з захаваннем новых Паказанняў да шпіталізацыі, зацверджаных у верасні мінулага года, і дакладным размеркаваннем патокаў пацыентаў, гэта пытанне знікне з парадку дня. Звяртаю таксама ўвагу кіраўнікоў на марудныя тэмпы ўвядзення ў амбулаторна-паліклінічных установах пасады памочніка ўрача, задача якога — зменшыць нагрузку на ўрачэбны персанал.

Між іншым, доля бюджэтных выдаткаў, што накіроўваюцца ў першаснае звяно, павялічылася з 31,4 працэнта ў 2008 годзе да 35 працэнтаў летась, а ў 2010 годзе яна павінна вырасці да 40 працэнтаў. У рамках галіновай Праграмы пераасначэння амбулаторна-паліклінічных арганізацый летась было закуплена абсталявання на суму каля 30 млрд рублёў. Для інтэнсіфікацыі арганізацыі работы медыцынскага персаналу ў арганізацыях аховы здароўя ўкараняліся інфармацыйныя тэхналогіі. Напрыклад, 2009 года каля 30 працэнтаў амбулаторна-паліклінічных арганізацый былі аснашчаны аўтаматызаванымі інфармацыйнымі сістэмамі і лакальнымі сеткамі. 32,4 працэнта ўрачэбных амбулаторый мелі аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму «Урач агульнай практыкі» з падсістэмай «Дыспансэрызацыя». На думку міністра аховы здароўя, гэтага ўсё адно недастаткова, таму пастаўлена задача актывізаваць сёлета ўкараненне інфармацыйных сістэм у амбулаторна-паліклінічных арганізацыях, асабліва ў сельскай мясцовасці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Працяг тэмы ў наступным нумары.)*

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**

***Колькасць выпадкаў смерці ад усіх прычын павялічылася на 0,5 працэнта. Рост колькасці памерлых рэгіструецца за кошт росту смяротнасці асобаў ва ўзросце, старэйшым за працаздольны.***

***Колькасць памерлых у працаздольным узросце зменшылася ў параўнанні з 2008 годам на 1,1 працэнта. У структуры агульнай смяротнасці насельніцтва на працаздольны ўзрост прыпадае 23,5 працэнта.***

***У 2009 годзе паказчык узроўню суіцыдаў павялічыўся на 2,7 працэнта ў параўнанні з 2008 годам.***

***Колькасць памерлых ад захворванняў органаў стрававання павялічылася на 7,9 працэнта. Асноўнай прычынай смерці застаюцца па-ранейшаму дыфузныя захворванні печані, перш за ўсё цыроз.***

***Колькасць смяротных выпадкаў у выніку атручэння алкаголем зменшылася на 7,2 працэнта.***

***Аб'ём продажу ўсіх алкагольных напояў на душу насельніцтва павялічыўся з 6,7 літра абсалютнага алкаголю ў 1995 годзе да 12 літраў у 2009 годзе.***

# НАРАДЖАЛЬНАСЦЬ ПАЙШЛА НА СПАД

**У пачатку 2010 года ў Беларусі працягнулася скарачэнне колькасці насельніцтва. Як паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце, на працягу студзеня ў краіне нарадзіўся 8481 і памёр 12 391 чалавек.**

У параўнанні з леташнім студзенем колькасць грамадзян, якія памерлі, зменшылася на 229 чалавек. Але адначасова скарацілася і колькасць нараджэнняў — на 824 дзіцяці адносна студзеня мінулага года. Пры гэтым статыстыка сведчыць, што ў першым месяцы гэтага года, зноў жа ў параўнанні з аналагічным перыядам летась, беларусы сталі часцей браць шлюбы (на 6 працэнтаў) і радзей (на 5,5 працэнта) іх скасоўваць.

Адзіным фактарам, што крыху замаруджвае агульнае скарачэнне насельніцтва, застаецца міграцыя. Яе сальда засталося станоўчым: на працягу студзеня на сталае месца жыхарства да нас прыехала 1447, тады як з'ехалі з краіны — 558 чалавек. Такім чынам, паводле звестак статыстыкі, усяго па стане на 1 лютага ў Беларусі пражывала 9 млн 477,2 тыс. чалавек. У прыватнасці, сталіца налічвала 1 млн 835,2 тыс., Гомельская вобласць — 1 млн 437,6 тыс., Мінская — 1 млн 418,2 тыс., Брэсцкая — 1 млн 398,3 тыс., Віцебская — 1 млн 227,8 тыс., Магілёўская — 1 млн 91,1 тыс., Гродзенская вобласць — 1 млн 69 тыс. жыхароў.

**Сяргей ГРЫБ.**

# БЕЛАРУСКІЯ ПАЛЯКІ ЗАКЛІКАЮЦЬ ВАРШАВУ СПЫНІЦЬ ДЫСКРЫМІНАЦЫЮ ПОЛЬСКІХ СУАЙЧЫННІКАЎ У БЕЛАРУСІ

**Грамадзяне Беларусі польскай нацыянальнасці заклікаюць улады Польшчы спыніць дыскрымінацыйную палітыку адносна сваіх суайчыннікаў. Такая заява змешчана ў іх адкрытым звароце да Прэзідэнта, маршалка Сената і Сейма, прэм'ер-міністра Рэспублікі Польшча, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.**

«Мы заклікаем не дзяліць палякаў на сваіх і чужых. У шматнацыянальнай Беларусі ўсе народы адчуваюць сябе паўнапраўнымі грамадзянамі сваёй краіны незалежна ад нацыянальнасці і веравызнання, — адзначаецца ў звароце. — Мы заяўляем, што Анжэліка Борыс і яе невялікае асяроддзе не ўпаўнаважаны прадстаўляць інтарэсы польскай меншасці, якая пражывае ў Беларусі. Гэтыя людзі дыскрэдытуюць сябе парушэннем законаў нашай дзяржавы, пастаяннымі спробамі распаліць канфлікт сярод паланійцаў».

У звароце падкрэсліваецца, што беларуская дзяржава ніколі не парушала і не парушае правы нацыянальных меншасцяў, а наадварот — садзейнічае забеспячэнню правоў гэтых меншасцяў. «У нашай краіне створаны ўсе ўмовы для атрымання адукацыі на польскай мове, яе вывучэння, захавання і развіцця гісторыка-культурнай спадчыны польскага народа, — адзначаюць тыя, хто падпісаўся. — Усе дамы паляка, якія існуюць на тэрыторыі рэспублікі, актыўна ажыццяўляюць сваю культурна-асветную дзейнасць».

Удзельнікі звароту просяць арганізаваць сустрэчу прадстаўнікоў СПБ з афіцыйнымі асобамі Польшчы, а таксама «прыняць меры па спыненні разгулу фальшу ў польскіх СМІ» і даць магчымасць польскай грамадскасці выслухаць аб'ектыўную інфармацыю непасрэдна ад саміх палякаў.

**Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні начальніку аддзела бухгалтарскага ўліку Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Але Мікалаеўне Сямашка з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора — смерці МАЦІ.**

# ДЭКЛАРАЦЫІ — ТОЛЬКІ ДА 1 САКАВІКА

Сёлета да 1 сакавіка ўключна падаць дэкларацыі павінны тыя фізічныя асобы, хто летась атрымліваў даходы за мяжой і (або) з-за мяжы; прадалі за год два і больш аўтамабілі; прадалі на працягу апошніх 5 гадоў дзве і больш кватэры, дачы, дамы, зямельныя ўчасткі; атрымлівалі даходы ад іншых фізічных асобаў, або ў іншых выпадках, калі падаткі з такіх даходаў не ўтрымліваюцца падатковымі агентамі. Таксама трэба дэклараваць і такія даходы, атрыманыя ад арганізацый і прадпрымальнікаў, што падаткам не абкладаюцца, але кошт якіх за год склаў больш за 150 базавых велічыняў (падарункі, прызы і інш.), даходы ў памеры больш за 500 базавых велічыняў, якія былі атрыманыя ў якасці дарэння ад рэзідэнтаў нашай краіны (не сваякоў). Нагадаю, што падатковымі рэзідэнтамі Беларусі з'яўляюцца фізічныя асобы, якія фактычна былі на тэрыторыі нашай краіны больш як 183 дні ў годзе.

У суботу і нядзелю падатковыя інспекцыі працуюць з 9.00 да 13.00, а 1 сакавіка — з 8.00 да 20.00. Дакладную інфармацыю па адрасах інспекцый можна адшукаць на сайце Міністэрства па падатках і зборах Беларусі www.nalog.by.

**Сяргей КУРКАЧ.**


## Уважаемые акционеры ОАО «ЭЛЕКТРОРЕМОНТНЫЙ ЗАВОД»

**31 марта 2010 года** состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Электроремонтный завод», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 19.

Собрание пройдет по адресу: г. Минск, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, 19, третий этаж, зал заседаний.

**Повестка дня собрания:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году и основных направлениях деятельности Общества на 2010 год.
2. О работе Наблюдательного совета в 2009 году.
3. Утверждение акта проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год; о результатах аудиторской проверки.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2009 год. О выплате дивидендов за 2009 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2010 год. Периодичность выплаты дивидендов за 2010 год.
7. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.
8. Избрание членов Наблюдательного совета.
9. Избрание членов Ревизионной комиссии.
10. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 19 (отдел кадров) с 22.03.2010 г. по 30.03.2010 г. (время работы с 12.00 до 15.00) и в день проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 12.00 до 12.45 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 31 марта 2010 года в 13.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра акционеров на 01 марта 2010 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНН 100008169.


## Абзац

**Міліцыянер-хабарнік затрыманы ў Дубровенскім раёне, паведамілі БЕЛТА ў пракуратуры. Супрацоўнік праваахоўных органаў атрымаў $150 ад арганізатара незаконнага вывазу чорнага металу з Беларусі ў Расію за непаказванне ў пратаколе аб адміністрацыйным правапарушэнні наяўнасці грузу. Такім чынам уладальнік хацеў атрымаць мінімальны штраф за сваё правапарушэнне ў судзе і захаваць 4 т чорнага металу. За падбухтораванне да дачы хабару заведзена крымінальная справа ў дачыненні і да інспектара ДПС ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама, які рэкамендаваў кантрабандысту «патрэбнага» чалавека.**

Пракуратура Брэсцкай вобласці завяла крымінальную справу ў дачыненні да дырэктара РУП «Палеская доследная станцыя меліярацыйнага земляробства і лугаводства», дэпутата Лунінецкага раённага Савета. Ён падазраецца ў тым, што ў снежні 2009 года, перавысіўшы службовыя паўнамоцтвы, нанёс урон прадпрыемству ў памеры Br30,8 млн.

**У Мінску невядомы злачынца «замініраваў» казіно. 25 лютага каля 21.15 невядомы патэлефанаваў па нумары 102 і заявіў, што ў казіно «Мінск Прынцэс гатэль» на вуліцы Няміга закладзена выбуховая прылада. Падчас агляду памяшкання ніякіх выбуханебяспечных прадметаў выяўлена не было. Міліцыя шукае аўтара паведамлення аб мініраванні.**

У Цэнтральным раёне Мінска затрыманы зладзей, які спецыялізаваўся на крадзяжах з незачыненых кабінетаў у розных установах. Мяркуецца, што на рахунку 43-гадовага неадназова судзімага мінчаніна больш як дзясятак крадзяжоў. Пакуль размова ідзе аб трох злачынствах, ва ўчыненні якіх ён афіцыйна падазраецца. У адным выпадку зламыснік зайшоў у памяшканне медыцынскага кабінета ў будынку стадыёна футбольнага манежа і, выкарыстаўшы сітуацыю, выцягнуў з пакінутай сумачкі кашалёк, пасля чаго знік. Другі крадзеж быў учынены ў лабараторыі медыцынскага цэнтра «Маці і дзіця». Падчас спробы трэцяга крадзяжу, зноў у футбольным манежы, злодзей быў затрыманы.

## Поўны абзац



**Жанчыну ад смерці выратавалі сіліконавыя грудзі. Падобна на тое, што з'явіліся новыя факты на карысць сіліконавых імплантантаў у грудзі. Лідзіі Каранзэ ўдалося выжыць пасля агнястрэльнага ранення дзякуючы сіліконавым устаўкам у грудзі. Жанчына пацярпела, калі злачынец адкрыў агонь з паўаўтаматычнай вінтоўкі ў стаматалагічнай клініцы ў горадзе Бевэрлі-Хілз у Каліфорніі. Па словах хірурга, імплантанты перашкодзілі фрагментам кулі закрануць жыццёва важныя органы жанчыны.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***


В извещении о проведении аукциона по продаже имущества, принадлежащего на праве хозяйственного ведения РУП «Гомельэнерго», опубликованного в газете «Звязда» № 26 от 12.02.10 г., в заглавии **ИСКЛЮЧИТЬ СЛОВА: «с применением метода понижения начальной цены»**, далее по тексту.

УНП 400173626.

## ОАО «БЕЛСЕЛЬЭЛЕКТРОСЕТЬСТРОЙ»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 30 МАРТА 2010 ГОДА ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Повестка дня:**

1. О порядке ведения собрания.
2. Отчет дирекции о результатах деятельности в 2009 году и задачи на 2010 год.
3. Отчет Наблюдательного совета о деятельности в 2009 году.
4. Отчет-заключение Ревизионной комиссии по годовому отчету.
5. Утверждение годового баланса Общества за 2009 год.
6. Утверждение размера дивидендов за 2009 год и сроки их выплаты в 2010 году.
7. Утверждение сметы использования чистой прибыли в 2010 году.
8. Выборы членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. Определение вознаграждения членам выборных органов.

Место проведения: г. Минск, ул. Сухая-3.
Начало в 15 часов.
Начало регистрации в 13 часов.
Тел. для справок: (017) 226 77 39, 203 63 64, 226 66 47.

**Для регистрации на собрании акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров – паспорт и нотариально оформленную доверенность.**

УНП 100120777. Наблюдательный совет ОАО «Белсельэлектросетьстрой».

## «ПРИОРБАНК» Открытое акционерное общество извещает своих акционеров, что 12 марта 2010 года состоится очередное Общее Собрание акционеров банка

Собрание состоится в г. Минске по адресу: ул. Сторожевская, 15 в 10.00.

Регистрация участников будет осуществляться с 9.00 до 9.45. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим служебное положение).

**Повестка дня:**

1. Отчет Наблюдательного Совета банка за 2009 год.
2. Отчет Правления о работе банка за 2009 год и основные направления деятельности на 2010 год.
3. Рассмотрение заключения Ревизионной комиссии по результатам проведения ревизии за 2009 год; утверждение годового отчета за 2009 год: баланс банка, отчет о прибыли и убытках, отчет об изменении капитала и отчет о движении денежных средств; распределение прибыли за 2009 год.
4. Установление размера дивидендов и срока их выплаты.
5. Внесение изменений в Устав «Приорбанк» ОАО.
6. Внесение изменений в Положение о Наблюдательном Совете «Приорбанк» ОАО.
7. Избрание Ревизионной комиссии «Приорбанк» ОАО.
8. Избрание Наблюдательного Совета «Приорбанк» ОАО.
9. Изменение состава Правления «Приорбанк» ОАО.
10. Вопросы Почетного консульства.
11. Предоставление безвозмездной (спонсорской) помощи.
12. Определение размера вознаграждения, компенсаций расходов членам Наблюдательного Совета, Ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей.
13. Информация об аффилированных лицах «Приорбанк» ОАО.

**Наблюдательный Совет, Правление «Приорбанк» ОАО.**

УНП 100220190.


# ПРЫЁМНЫ ЦЯХЦІН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### Не сядзець на канапе

Не бывае ў жыцці ўсё так гладка, як у казцы. Цяжкасцяў у выхаванні дзяцей нямала: праблемы з вучобай, ранімая псіхіка, інтэрнатаўскія звычкі.

— Аднойчы старэйшая дзяўчынка нават у лес спрабавала збегчы, калі ёй надакучылі клопаты па хатняй гаспадарцы, — прызнаецца Раіса Іванаўна. — Але я дагнала, папрасіла прабачэння і патлумачыла, што свая хата — не інтэрнат, давядзецца посуд мыць і падлогу месці. Ну а потым ёй у школе растлумачылі, што добрая маці не садзіць сваю дачку на канапу, а вучыць рабіць. Так што потым і яна прыйшла да мяне прасіць прабачэння. Так і саступалі адна адной, шукалі паразумення.

Спагадлівая Раіса Іванаўна дазволіла нават прыязджаць для сустрэчаў з дзецьмі іх біялагічным бацькам, хоць яны — алкаголікі, у якіх адабралі дзяцей.

— Я хацела, каб дзеці ведалі свае карані і каб іх сапраўдныя бацькі адумаліся, — тлумачыць прыёмная маці.

Аднак з гэтага добрага намеру плёну не было: яны прыязджалі і працягвалі піць на месцы, таму далей вырашылі такіх гасцей не пускаць, каб не падавалі дзецям дурны прыклад. Іх маці трапіла за краты, а бацьку ў п'янай сварцы забіў брат.

— У старэйшай дзяўчынкі такая крыўда на сэрцы, што не хоча родную маці і ведаць, — шкадуе Раіса Іванаўна. — А малыя ніколі і не ўзгадваюць пра яе. Я хачу іх выхаваць, каб яны нічога не баяліся, елі дасыта, не калаціліся. У дзяўчынкі тут перастала балець сэрца, і дзякуй Богу за гэта.

Вось на што не скардзіцца гаспадыня, дык гэта на недахоп грошай. Пенсія, заробак прыёмных бацькоў, дапамога дзяржавы на дзяцей, свае агарод і козы. «Усім усяго хапае!»

Час ідзе: бачыш, хутка і прыёмныя дзеці прывязуць у Цяхцін сваіх дзяцей. І трэба будзе ставіць на ногі наступнае пакаленне.

— Страшна не шмат дзяцей мець, а страшна застацца аднаму, — упэўнена Раіса Іванаўна. — Ну што б я адна днямі рабіла? А тут дзень прабягае, я яго і не заўважаю. Нібыта старонку календара пераварочваю.

### Не грошы, а шчасце

**Старшыня Цяхцінскага сельскага Савета Мікалай ШАКУРА** кажа, што прыёмныя дзеці — гэта сапраўды не навіна для аграгарадка. Першае прыёмнае дзіця з'явілася ў Цяхціне гадоў 10 таму, калі ў краіне распачалася вялікая кампанія па стварэнні нармальных умоў жыцця і выхавання дзяцей, якія засталіся сіротамі альбо якіх кідаюць бацькі-алкаголікі.

Вядома ж, сельскі Савет правярае, як ставяцца прыёмныя бацькі да дзяцей і што яны для малых набываюць. І да таго ж Мікалай Адамавіч ніколі не падпіша характарыстыку нядбайным бацькам, таму што катэгарычна супраць, калі на прыёмных дзяцей глядзяць як на заробак, бо за іх выхаванне плацяць грошы.

— Ведаеце, першапраходцам у гэтай справе была жанчына, стаўку якой скарацілі на працы, — узгадвае **дырэктар Цяхцінскай школы Лілія ШАКУРА.** — Да пенсіі ёй было далёка, у гаспадарцы тады справы добра не ішлі. Сваіх дзяцей тая жанчына добра выхавала, таму і вырашыла ўзяць прыёмнае дзіця. І яно стала сапраўды родным, вучыцца цяпер у нас. Яшчэ адна жанчына працавала ў клубе, але яго зачынілі: узяла прыёмнага хлопчыка і выхоўвае, як свайго. Гэта ўсё душэўныя людзі, рознабаковыя інтарэсы тут сутыкаюцца, і ад гэтага ўсім добра.

Так, эканамічныя меркаванні сапраўды ёсць, але яны зусім не галоўныя ў гісторыях пра прыёмных бацькоў і дзяцей. Вырашыць свае матэрыяльныя праблемы вяскоўцу можна і іншым чынам. А каб выхоўваць дзіця, трэба яго шкадаваць і любіць.

— Матэрыяльны бок не мае значэння, я хачу хоць бы аднаго чалавечка зрабіць шчаслівым! — катэгарычна заявіла адна з прыёмных маці.

Самі прыёмныя бацькі свае ўчынкі гераізмам не лічаць, расказваюць пра жыццё будзённа, але ўсё ж і паплачуць над лёсамі сваіх прыёмышаў. Дзеці адчуваюць надзейную падтрымку сваіх татаў і мамаў, і даверліва глядзяць ім у вочы.

### Сюрпрыз для маці

**Валянціна Аляксееўна ФІЛІПАВА і яе прыёмная дачка Лера,** якой цяпер 9 гадоў, нават падобныя. Тонкія, бялявыя, са светлымі вачыма. Дзяўчынка, у прынцыпе, ведае, што яна — прыёмная дачка, але не звяртае ўвагі на гэта, жыве і адчувае сябе роднай. Яна не цікавіцца сваімі біялагічнымі бацькамі. Гэтак жа, як і яе прыёмная маці: Валянціна Аляксееўна не хоча нічога ведаць пра людзей, якія кінулі дзяўчынку.

— Ад тых бацькоў засталося толькі прозвішча, але прозвішча ў жыцці ролі не адыгрывае, — цвёрда кажа жанчына. — Мы жывём сям'ёй, родныя людзі.

Увогуле прыёмных дзяўчатак у яе дзве. Гісторыя звычайная: свае трое дзяцей выраслі і з'ехалі, а жыццё па маршруце «хата-праца» жанчыну і яе мужа не задавальняла. Так у іх з'явіліся спачатку Насця, а потым, у выніку выпадковага візіту ў сацыяльны прытулак, і маленькая Валерыя.

Старэйшая дзяўчынка цяпер вучыцца ў Магілёве ў гімназіі для дзяўчатак-сірот, і тэлефануе ледзь не штодня бацькам, сумуе. А малодшая ходзіць у школу і цягнецца да сцэны, спявае і танцуе.

— Аднойчы я захварэла і трапіла ў бальніцу, — расказвае Валянціна Аляксееўна. — І тут у школе настаўніца дала дзецям заданне: напісаць пра самае сваё вялікае жаданне. Усе пісалі пра рознае: адзін хоча веласіпед, іншы — камп'ютар. А мая Лера напісала: хачу, каб мама пайшла на папраўку і вярнулася дадому. Я, вядома ж, плакала...

Спраўляцца з прыёмнымі дзецьмі Валянціне Аляксееўне дапамагала старэйшая сястра. Аднойчы яны разам трапілі ў Магілёў: прыехалі нібыта па пакупкі, а нечакана прыйшлі... у дзіцячы прытулак. У выніку Марыя Аляксееўна Латышава стала прыёмнай мамай брата і сястрычкі, якія сёння таксама ходзяць у школу.

— Калі дзеці бачаць, што пра іх клапоцяцца ў сям'і, то і яны імкнуцца адказаць тым жа, — лічыць Лілія Фёдараўна Шакура. — Аднойчы мы павезлі дзяцей у санаторый на аздараўленне. Там ім давалі садавіну. І прыёмны сын Марыны Аляксееўны не еў апельсіны, а складваў іх у кайстру. Калі знайшлі гэты склад, то дзіця цвёрда сказала, што рыхтуе гасцінец для мамы і таты. Маўляў, яны да мяне прыязджалі і ласункі прывозілі, а цяпер і я для іх раблю сюрпрыз!



Раіса Іванаўна ЦАПІК і ўнук-«анёльчык» Захар.

### Карані радасці

У **Цяхцінскай школе імя Бялыніцкага-Бірулі** вучыцца болей прыёмных дзяцей, чым у іншых навучальных установах Бялыніцкага раёна. Таму тут нядаўна праводзілі спецыяльны семінар, дзе тутэйшыя прыёмныя сем'і, бацькі і дзеці, расказвалі пра свае захапленні і рабілі радаводныя дрэвы. У выніку атрымаўся сямейны сад — сімвал таго, як чужыя сэрцы становяцца роднымі.

— Разумееце, прыёмнае дзіця — гэта спачатку як дрэва без каранёў, якое проста падпіраюць педагогі і псіхолагі, каб не ўпала, — лічыць кіраўнік школьнага гуртка «Сям'я» Ірына Траццякова. — Але калі яно звяжацца каранямі са сваёй новай сям'ёй, вось тады дзіця адаптуецца да жыцця і будзе нармальным чалавекам.

У школе разумеюць, што прыёмным дзецям з цяжкасцю даецца вучоба, таму падрыхтоўка хатніх заданняў забірае шмат сілаў, часу і нерваў. Малым з прытулкаў і дзіцячых дамоў даводзіцца даганяць сваіх аднагодкаў, але школьныя педагогі разумеюць сітуацыю і імкнуцца дапамагчы.

— Вось апошнім разам прыёмныя бацькі прыходзілі параіцца, што рабіць з хлопчыкам, які замкнёны і мала кантактуе з людзьмі, — расказвае дырэктар. — Я сказала, што такі ў яго характар, і аб калена яго не пераламаць. Трэба жыць, выхоўваць, цярпліва ставіцца да яго. А ён хлопчык добры, і з цягам часу ўсё выправіцца.

Лілія Фёдараўна Шакура ведае прыклады, калі прыёмныя дзеці ад дабрыні і ласкі мяняюцца, нібыта наноў нараджаюцца. У Любові Ігнацьеўны Цапік тры сыны, але яна заўсёды марыла пра дзяўчынку. Так у сям'і з'явілася прыёмная дачка Крысціна. Яна спачатку не гаварыла, толкам не ела і вельмі баялася людзей. Відаць, шмат ад іх нацярпелася. Цяпер вучаніца 3-га класа Крысціна — смяшлівая дзяўчынка, якая штораніцы ідзе ў школу са старэйшым братам Раманам. Прычым 11-класнік цягне партфель сястры: «Яна яшчэ маленькая, шкада!»

У школе ўпэўненыя, што ўсіх прыёмных дзяцей чакае дастойная будучыня, бо яны будуць браць прыклад са сваіх бацькоў і іх дарослых дзяцей, якія, як правіла, добра ўладкаваліся ў жыцці.

— А тое, што ў нашым Цяхціне так шмат прыёмных сем'яў, дык тут добрыя людзі жывуць, — упэўнена дырэктар школы Лілія Шакура. — Абяздоленых малых стала на гэтым свеце трошку меней. Дзеці прыносяць людзям радасць.

**Ілона ІВАНОВА.**

*Бялыніцкі раён.*

**Народная лекарка з Бялыніччыны Фядора КОНЮХАВА:**

— Я аднойчы разглядала фотаздымкі адной знаёмай, і сярод некалькіх соцень у кіпе выбрала толькі адзін са станоўчай энергетыкай. Гэта было фота звычайнай жанчыны. Аказалася, што яна аўдавела і засталася без дзяцей, адна. Таму вырашыла ўзяць у дзіцячым доме выхаванца. Хацела аднаго, а ўзяла пяцёра. Вось ад гэтай дабрыні і энергетыка. Але калі казаць па энергетычных законах, то я лічу, што гэтыя людзі не бяруць чужых дзяцей на выхаванне, а знаходзяць сваіх, якія нейкім чынам аддаліліся ад іх.

## ПАСЛЯ ВЕЧАРЫНЫ ЗГАРЭЎ ТЭЛЕВІЗАР

26 лютага на досвітку загарэлася кватэра на першым паверсе жылога дома на вуліцы Чырвонаармейскай у Быхаве. Суседзі адчулі пах дыму і выклікалі выратавальнікаў. Гаспадар кватэры, 30-гадовы мужчына, яшчэ да прыезду падраздзялення МНС выскачыў з кватэры, якая гарэла, праз разбітую шыбу. Аднак у кватэры заставалася 29-гадовая жанчына, якую выратавальнікі знайшлі на падлозе ў стане непрытомнасці. Яна шпіталізаваная з атручэннем прадуктамі гарэння. У пакоі згарэў тэлевізар і пакрывала. Цяпер следства разглядае дзве версіі гэтага пажару: кароткае замыканне электраправодкі альбо неасцярожнасць пры курэнні, таму што пасля вечарыны каля тэлевізара засталася драўляная попельніца з недакуркамі.

**Ілона ІВАНОВА.**


## ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 29 марта 2010 г. в 10.30 состоится закрытый аукцион по продаже права на заключение договоров аренды торговых объектов, расположенных в г. Бобруйске по ул. Советской, 113 в торговом доме «Пассаж-Плюс», принадлежащих на праве собственности ОДО «Сантарес», в составе:

| № лота | № торгового объекта | Площадь торгового объекта, кв.м | Начальная цена продажи, на 11 месяцев, бел. руб. (без НДС) | Начальная цена продажи, на 3 года, бел. руб. (без НДС) | Задаток, % от начальной цены продажи |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1 | 63,82 | 32 400 000 | 106 036 380 | 10 % |
| 2 | 3 | 11,2 | 6 520 000 | 21 338 172 | 10 % |
| 3 | 4 | 11,02 | 6 420 000 | 21 010 896 | 10 % |
| 4 | 5 | 17,82 | 9 560 000 | 31 287 276 | 10 % |
| 5 | 6 | 14,97 | 8 740 000 | 28 603 620 | 10 % |
| 6 | 7 | 15,0 | 8 750 000 | 28 636 380 | 10 % |
| 7 | 8 | 11,52 | 6 720 000 | 21 992 724 | 10 % |
| 8 | 9 | 14,84 | 8 650 000 | 28 309 104 | 10 % |
| 9 | 10 | 11,07 | 6 460 000 | 21 141 828 | 10 % |
| 10 | 11 | 9,8 | 5 720 000 | 18 720 000 | 10 % |
| 11 | 12 | 5,54 | 3 240 000 | 10 603 620 | 10 % |
| 12 | 12/1 | 9,46 | 5 570 000 | 18 229 104 | 10 % |
| 13 | 14 | 11,5 | 6 720 000 | 21 992 724 | 10 % |
| 14 | 15 | 22,31 | 12 000 000 | 39 272 724 | 10 % |
| 15 | 16 | 23,15 | 12 440 000 | 40 712 724 | 10 % |
| 16 | 17 | 8,55 | 5 150 000 | 16 854 552 | 10 % |

Ставка арендной платы: 0,6 базовой величины за 1 кв/м торговой площади.

Условия продажи: в аукционе имеют право участвовать физические и юридические лица, а так же индивидуальные предприниматели, согласно списку, утвержденному собственником торговых объектов.

Торговые объекты сдаются в аренду сроком на 11 месяцев либо на 3 года по выбору арендатора, начиная с 01.04.2010 г.

Срок заключения договора аренды: до 01.04.2010 г.

| | |
|---|---|
| **Условия оплаты** | Договор аренды на 3 года – стоимость права на заключение договора аренды вносится разовым платежом в течение 3 месяцев с даты заключения договора аренды; договор аренды на 11 месяцев – стоимость права на заключение договора аренды вносится равными частями в течение всего срока аренды. |
| **Место проведения торгов** | г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» (р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509), г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 |
| **Номер расчетного счета для внесения задатка** | **Получатель платежа ОДО «Сантарес» – р/с 3012000007615 в Филиале № 703 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 760, УНН 790201822** |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | **до 26 марта 2010 г. включительно** |

**Для участия в аукционе в адрес Организатора торгов необходимо предоставить:** заявление на участие в аукционе; заверенную банком копию платежного поручения о внесении размера задатка, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: индивидуальным предпринимателям:** свидетельство о гос. регистрации индивидуального предпринимателя (оригинал и копия), представителю индивидуального предпринимателя – нотариально заверенную доверенность, **юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации (руководителю – копию приказа (протокола) о назначении на должность); **представителям физ. лиц** – нотариально заверенную доверенность. **Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.** Задаток, внесенный Победителем, будет зачтен в счет окончательной стоимости права на заключение договора аренды торгового объекта, сформированной на аукционе, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **Организатор торгов или Продавец вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.**

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляет Победитель (Претендент на покупку) не позднее 31.03.2010 г. на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов до проведения аукциона.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**



# Сучасны дызайн старажытнага майстэрства

Жаночы скураны капялюш (на мой мужчынскі погляд) быў суперэлегантным. І сукеначка падобная на сарафанчык таксама была што трэба — яе пашылі зноў-такі з тонкай скуры. Такі ж самы матэрыял спатрэбіўся на маляўнічыя пано, прысвечаныя фантастычнай рыбіне, казачнаму кату, таямнічаму кажану. Чарапаха была як натуральная, цьмяны бляск скураной паверхні нібы адлюстроўваў водныя глыбіні, з якіх яна прыплыла ў выставачную залу.

Урэшце, выстава работ мінчанкі Ірыны Дзёмінай — мастака, дызайнера, майстра дэкаратыўна-прыкладнога кірунку, поўнілася той атмасферай, якую ствараюць незвычайныя рэчы, выраблены з такога ж незвычайнага матэрыялу.

— Са скурай я працую даўно, — кажа аўтар, — а яшчэ даўней была магчымасць чуць ад родных, як гэты матэрыял апрацоўвалі, выраблялі. Цяпер усё раблю сама — нікому не даверу нават аднаго шыўка зрабіць. Захапляе пошук формы, фактуры, колеру...

Акадэмічная адукацыя мастака дала Ірыне шырокі кругагляд і разняволенасць у эксперыментах. Працавітасць і ўпартае ўдасканальванне рэдкай тэхнікі прывялі да вышыняў майстэрства. З гэтых складнікаў сілкуецца тое, што аб'ядноўвае майстроў усіх відаў мастацтва — ТВОРЧАСЦЬ.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

## САМЫ ХАДАВЫ ТАВАР — БОТЫ З КАЛЯРОВАЙ ГУМЫ

Рэалізацыя валенага абутку па выніках зімовага сезона ва ўнівермагу «Беларусь» павялічылася ў чатыры разы. Асаблівым попытам карысталіся валёнкі з гумавай падэшвай. Рэалізацыя санак на працягу такой снежнай зімы ўзрасла ва ўнівермагу «Беларусь» удвая, у тым ліку асаблівай папулярнасцю карысталіся санкі-лядзянкі, якія спадабаліся дзятве.

Продаж гумавага абутку павялічыўся ў 2,5 раза ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Ніколі яшчэ так ахвотна не раскуплялі гараджане боты з каляровай гумы. Гэта звязана і з небывалай колькасцю вады на вуліцах, і модай на гумавы абутак, якая прыйшла з Захаду. Але калі за мяжой кошт на модныя боцікі з гумы можа дасягаць часам і сотні долараў, то ва ўнівермагах Мінска максімум 70 тысяч рублёў. Пры гэтым сярэдні ўзровень коштаў нашмат ніжэйшы: мужчынскіх гумавых ботаў — 40 тысяч рублёў, жаночых — 30 тысяч, дзіцячых — 20 тысяч.

**«Мінск—Навіны».**

## МОГ БЫ ВЁСКУ АБУЦЬ

На аўтадарозе «Мінск — Віцебск» ноччу супрацоўнікі міліцыі і падатковай інспекцыі па Лепельскім раёне затрымалі аўтамабіль «Фальксваген», на якім жыхар Баранавічаў вёз 289 параў абутку.

Спецыяльныя кантрольныя знакі на гумавым абутку вытворчасці Расіі адсутнічалі. Склалі адміністрацыйны пратакол. Абутак на суму больш за 11,7 мільёна рублёў канфіскавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ПОМНІК «ЮРАЎСКАМУ КАРАГОДУ» І ВЁСЦЫ ПАГОСТ

— Гэта першы і адзіны ў Беларусі і тым больш на Палессі помнік, прысвечаны аб'екту нематэрыяльнай спадчыны, — кажа жыхарка вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна, кіраўнік этнічнага гурта «Міжрэчча» Кацярына Панчэня і звяртае ўвагу на сімвалы — «граблі» з ручніком і каравай хлеба.

Помнік сапраўды ўнікальны. Па форме і, галоўнае, змесце. Яшчэ ніколі не ўзводзілі ў нас помнікі традыцыям і абрадам.

Жыхары Пагоста захавалі старажытны вясновы абрад «Юраўскі карагод», які ў іншых палескіх вёсках ужо не існуе. Сімвалы гэтага абраду — сапраўдны каравай, упрыгожаны кветкамі, і граблі з начэпленымі на іх фартушкамі зялёнага і чырвонага колераў. Гэтыя вобразы і склалі аснову кампазіцыі крыжа-помніка.

Кацярына Аляксееўна Панчэня — прызнаная ў колах фалькларыстаў і захавальнікаў народных традыцый і звычаяў лепшым голасам Палесся. Некалі, адчуўшы імклівае змяненне вясковага ўкладу і самабытную культуру Палесся, якая знікала, разам з вяскоўкамі яна ўтварыла гурт і, па сутнасці, стала на абарону безабароннай унікальнай спадчыны. Жанчыны першымі «ажывілі» і панеслі свой «карагод». Яшчэ да надання абраду ахоўнага дзяржаўнага статусу ў Пагост ехалі пачаткоўцы і сталыя фалькларысты, студэнты і аспіранты, каму прагнецца прыпасці да чысцюткай крыніцы духоўнага багацця палескага края. Цяпер жа сюды імкнуцца дэлегацыі, скіроўваюць экскурсіі.

Акрамя карагода на Юр'я, Пагост багаты і на іншыя абрады — «Жаніцьбу коміна», «Гуканне вясны» з птушачкамі і чыста пагостаўскія калядаванні — з сарокаю, буслом і куццёю.

— Бясспрэчна, помнік на ўездзе ў вёску — падзяка і прызнанне маім простым і сціплым аднавяскоўцам, — кажа нястомная працаўніца на зямлі і культурнай ніве Кацярына Панчэня.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**



Удзельніцы гурта «Міжрэчча» Кацярына ПАНЧЭНЯ (злева) і Зоя КАЦЯНЁВА.

БТА БАНК

**ЗАВЕРЕНО**
*Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 25 февраля 2010 г.*

**УТВЕРЖДЕНО**
*Наблюдательным Советом ЗАО «БТА Банк» 15 февраля 2010 г. Протокол № 3*

# ИЗМЕНЕНИЯ И ДОПОЛНЕНИЯ № 1

**в Проспект эмиссии облигаций первого и второго выпусков**

Закрытого акционерного общества «БТА Банк» (ЗАО «БТА Банк»),

*утвержденного Наблюдательным Советом ЗАО «БТА Банк» 12 января 2009 г., протокол № 2*

*(далее – Проспект эмиссии)*

1. Пункт 1.4. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:

**«1.4. Номер расчетного и валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций**

ЗАО «БТА Банк» имеет следующие основные корсчета:

корреспондентский счет в белорусских рублях № 3200007040004 в Национальном банке Республики Беларусь, код 042;

валютный счет в долларах США № 3582023482001 в Standard Chartered Bank, New York, NY, SWIFT: SCBLUS33».

2. В подпункте 1.6.2. пункта 1.6. из исключительной компетенции Наблюдательного совета ЗАО «БТА Банк» исключить полномочие: «утверждение решений Кредитного комитета о списании безнадежной кредитной задолженности, а также принятие решений о списании другой безнадежной к взысканию задолженности».

3. В подпункте 1.6.3. пункта 1.6. в компетенции Председателя Правления полномочие: «осуществляет найм, перемещение и увольнение работников Банка (увольнение работников, являющихся членами Правления, осуществляется в соответствии с законодательством и решениями Общего собрания акционеров)» изложить в следующей редакции: «осуществляет найм, перемещение и увольнение работников Банка (увольнение работников, являющихся членами Правления, осуществляется в соответствии с законодательством и решениями Наблюдательного совета)».

4. Подпункт 1.7.1. пункта 1.7. изложить в следующей редакции:

**«1.7.1. Список членов Наблюдательного совета ЗАО «БТА Банк»**

| № п/п | Фамилия, имя, отчество | Год рождения | Образование | Занимаемые должности в настоящее время и за три предшествующих года | Количество принадлежащих акций эмитента | Размер в Уставном фонде эмитента в процентах |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Варенко Николай Витальевич | 1971 г. | Московский государственный институт международных отношений,<br>экономист<br>Лондонская школа экономики, банковское дело и финансы<br>Оксфордский университет, Англия,<br>магистр делового администрирования | Первый заместитель Председателя Правления АО «БТА Банк» (Казахстан)<br>с августа 2009 г. по настоящее время – Первый заместитель Председателя Правления АО «БТА Банк» (Казахстан);<br>февраль 2009 г. – август 2009 г. – Заместитель Председателя Правления АО «БТА Банк» (Казахстан);<br>2005 г. – 2009 г. – Президент АО «Венчурный фонд «Адвант» | – | – |
| 2. | Зданович Лариса Петровна | 1968 г. | Казахский политехнический институт им. В.И. Ленина,<br>инженер<br>Казахская государственная академия управления,<br>экономист | С 2009 г. и по настоящее время – Директор по инвестициям и капиталу и работе с региональными банками АО «БТА Банк» (Казахстан)<br>2003 – 2009 гг. – директор Аналитического центра АО «Банк ТуранАлем» (Казахстан) | – | – |
| 3. | Цуркан Олег Григорьевич | 1968 г. | Казахский государственный университет им. С.М. Кирова,<br>биология<br>Казахский институт менеджмента, экономики и прогнозирования, менеджер (деловое администрирование) | с ноября 2008 г. – член Совета Директоров Казахстанской Фондовой Биржи,<br>с июня 2007 г. по настоящее время – Управляющий директор АО «БТА Банк» (Казахстан)<br>ноябрь 2004 – июнь 2007 – советник Председателя Правления АО «БТА Банк» (Казахстан) | – | – |

5. Подпункт 1.7.2. пункта 1.7. изложить в следующей редакции:

**«1.7.2. Состав Правления ЗАО «БТА Банк»**

| № п/п | Фамилия, имя, отчество | Год рождения | Образование | Занимаемые должности в настоящее время и за три предшествующих года | Количество принадлежащих акций эмитента | Размер в Уставном фонде эмитента в процентах |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1. | Маренов Султан Тулегенович | 1979 г. | Алмаатинский государственный университет,<br>Финансы и кредит | 01.10.04 – 31.10.2005 – АО «БТА Банк» (Казахстан), начальник отдела развития торгового финансирования Управления международного торгового финансирования<br>с 01.11.2005 по настоящее время – Председатель Правления ЗАО «БТА Банк» | – | – |
| 2. | Какимжанов Ахат Мухамет-канович | 1977 г. | Восточно-казахстанский государственный университет,<br>финансы и кредит | 01.01.2006 – 01.05.2006 – начальник отдела анализа проектов Управления поддержки продаж малого и среднего бизнеса АО «Банк ТуранАлем» (Казахстан)<br>02.05.2006 – 31.05.2006 – заместитель начальника Управления малого и среднего бизнеса АО «Банк ТуранАлем» (Казахстан)<br>01.06.2006 – 30.09.2006 – начальник Управления малого и среднего бизнеса АО «Банк ТуранАлем» (Казахстан)<br>01.10.2006 – 28.11.2008 – начальник Управления поддержки малого и среднего бизнеса Блока малого и среднего бизнеса АО «БТА Банк» (Казахстан)<br>01.12.2008 – 15.03.2009 – начальник Управления финансирования малого и среднего бизнеса ЗАО «БТА Банк» (Беларусь)<br>с 16.03.2009 г. по настоящее время – заместитель Председателя Правления ЗАО «БТА Банк» (Беларусь) | – | – |
| 3. | Машнина Елена Николаевна | 1964 г. | Белорусский государственный экономический университет,<br>международные экономические отношения | 14.04.2004 – 10.01.2006 – заместитель начальника Управления инспекции Главного Управления банковского надзора Национального банка Республики Беларусь;<br>11.01.2006 – 14.04.2007 – заместитель Председателя Правления АСБ «Беларусбанк»;<br>с 20.04.2007 – по настоящее время – заместитель Председателя Правления ЗАО «БТА Банк» | – | – |
| 4. | Титов Александр Михайлович | 1974 г. | Белорусский государственный экономический университет,<br>международные экономические отношения | 01.04.2005 – 31.07.2006 – исполнительный директор ЗАО «Астанаэксимбанк»;<br>с 01.08.2006 – по настоящее время – заместитель Председателя Правления ЗАО «БТА Банк» | – | – |
| 5. | Сергиевич Наталья Михайловна | 1964 г. | Белорусский государственный экономический университет,<br>бухгалтерский учет, контроль и анализ хозяйственной деятельности | 01.12.2004 – 30.04.2005 – начальник отдела бухгалтерского учета ЗАО «Астанаэксимбанк»;<br>01.05.2005 – 28.02.2007 – начальник Управления – заместитель Главного бухгалтера ЗАО «Астанаэксимбанк»;<br>01.03.2007 – 28.10.2007 – заместитель Главного бухгалтера ЗАО «Астанаэксимбанк»;<br>с 29.10.2007 – по настоящее время – Главный бухгалтер ЗАО «БТА Банк» | – | – |

6. Пункт 1.8. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:

**«1.8. Список акционеров, которые имеют пять и более процентов от общего количества акций**

| Наименование акционера | Количество простых (обыкновенных) акций | Сумма в уставном фонде (млн руб.) | Доля в уставном фонде (%) |
|---|---|---|---|
| Акционерное общество «БТА Банк», Республика Казахстан, 480099, г. Алматы, микрорайон Самал-2, ул. Жолдасбекова, 97 | 343 (Триста сорок три) | 54 674,20 | 99,71 |

7. Пункт 1.10. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:

**«1.10. Сведения об инвестициях в уставные фонды других юридических лиц с долей, равной пяти и более процентам уставного фонда**

| № п/п | Объект инвестиций | Размер участия | Доля участия в уставном фонде |
|---|---|---|---|
| 1. | ООО «Агродело» | 2,0 млн бел. рублей | 10 % |

8. Пункт 1.12. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:

**«1.12. Сумма зарегистрированного уставного фонда**

Размер зарегистрированного уставного фонда ЗАО «БТА Банк» составляет: 54.833.600.000,00 (Пятьдесят четыре миллиарда восемьсот тридцать три миллиона шестьсот тысяч) белорусских рублей. Уставный фонд разделен на 344 (Триста сорок четыре) простых (обыкновенных) акций номинальной стоимостью 159.400.000,00 (Сто пятьдесят девять миллионов четыреста тысяч) белорусских рублей.»

9. Пункт 3.7. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:

**«3.7. Рейтинговое агентство Fitch** в декабре 2008 года присвоило ЗАО «БТА Банк» (Беларусь) долгосрочный и краткосрочный рейтинг дефолта эмитента (РДЭ) в иностранной валюте на уровне «B», прогноз «негативный». Рейтинг поддержки присвоен на уровне «4». Индивидуальный рейтинг присвоен на уровне «E».

В ноябре 2009 года в процессе пересмотра рейтинга агентство Fitch подтвердило долгосрочный рейтинг дефолта эмитента (РДЭ) на уровне «CCC» с прогнозом «негативный», краткосрочный РДЭ подтвержден на уровне «C» и исключен из списка Rating Watch «негативный», индивидуальный рейтинг подтвержден на уровне «E», рейтинг поддержки подтвержден на уровне «5».

Исключение рейтинга ЗАО «БТА Банк» (Беларусь) из списка Rating Watch «негативный» отражает мнение Fitch о независимости выполнения белорусским банком своих обязательств от финансового состояния АО «БТА Банк» (Казахстан) и его способности исполнять свои обязательства. При этом учитывается исключение белорусского банка из процесса реструктуризации АО «БТА Банк» (Казахстан), сокращение зависимости в плане базы фондирования, а также текущее увеличение капитала банка со стороны основного акционера.

Индивидуальный рейтинг «E» отражает небольшую клиентскую базу ЗАО «БТА Банк» (Беларусь), но в то же время самостоятельную кредитоспособность, на конец III квартала 2009 г. доля проблемных кредитов составляла 1,3 % от общего кредитного портфеля.

ЗАО «БТА Банк» (Беларусь) имеет хорошее соответствие срочной структуры активов и пассивов и имеет положительные разрывы ликвидности по всем срокам. Банком также реорганизована структура пассивов в пользу клиентского фондирования (72 % базы фондирования на конец III квартала 2009 года) и осуществлена выплата почти всех межбанковских заимствований на внешних рынках.

На конец III квартала 2009 года показатель достаточности капитала первого уровня по соглашению Basel I у ЗАО «БТА Банк» (Беларусь) составлял 17 %, активы банка составляли около 91,0 млн долларов США».

**И.о. Председателя Правления** **А.М. Какимжанов**

**Главный бухгалтер** **Н.М. Сергиевич**

*ЗАО «БТА Банк». Лицензия НБРБ № 17 от 12.06.2008 г., УНП 807000071*

Два бакі медаля

# «ПАСЛЯ ЖОРСТКАЙ РАСПРАВЫ НАД ВАЛЕТАМ МОЙ СЫН ПЛАЧА ПА НАЧАХ»

Надзея ДРЫЛА

**Упачатку лютага сярод белага дня ў Стоўбцах на вуліцы Чыгуначнай раздаўся стрэл — паветра пранізала выццё сабак. Вікторыя разам з мужам і чатырохгадовым сынам у гэты час пілі гарбату на кухні. Зірнулі ў акно. І ўбачылі, як Валета, якога яны падкормлівалі і які начаваў на дыванку пад дзвярыма іх кватэры, цягнулі за лапы цераз дарогу...**

Жанчына, як была ў шортах і тапачках, выбегла на вуліцу. Раптам Валет падняў галаву — і з надзеяй паглядзеў на яе адным вокам, другое было прастрэлена.

— Я бегла, крычала, разумела, што Валет жывы і можна яшчэ нешта паправіць, — узгадвае Вікторыя. — Але тут адбылося нешта страшнае. Убачыўшы, што сабака жывы, той, хто яго цягнуў, стаў дабіваць ахвяру манціроўкай. Кроў ляцела ва ўсе бакі, а ён біў... Я плакала, маліла застрэліць Валета, каб не мучыўся. У адказ пачула, што страляць пры людзях нельга. Валета дабілі і разам з іншымі «валетамі» вывезлі, як смецце, на звалку. Кроў на снезе была паўсюль — быццам у Стоўбцах прайшоў крывавы дождж.

Вікторыя прызналася, што дагэтуль не можа апамятацца. А яе сын плача па начах, таму даводзіцца спаць з уключаным святлом.

— У кожным горадзе павінен быць калі не прытулак, то хоць бы часовы пункт утрымання адлоўленых жывёлаў, — лічыць жанчына. — Трэба даць сабаку шанц знайсці свайго старога альбо новага гаспадара. Бо адстрэльваюць жа ўсіх без разбору. Я на свае вочы бачыла дзве аб'явы на слупе наконт таго, што знік сабака.

У РУП «Стаўбцоўскае АКС», у сваю чаргу, прывялі невясёлую статыстыку: толькі летась безнаглядныя сабакі пакусалі 98 чалавек. На бяздомнага Валета, паводле іх слоў, напярэдадні скардзіліся жыхары дома № 37, што на вуліцы Чыгуначнай. Яны слёзна прасілі прыбраць сабаку, які гаўкае і не пускае ў пад'езд.

— Наш супрацоўнік, які там быў, пераконвае, што ніхто манціроўкай сабаку не дабіваў, — адказалі спецыяльнаму карэспандэнту «Звязды» ва Упраўленні ўнутраных спраў Стаўбцоўскага райвыканкама.

**Наталля БЯЛЯНАВА, старшыня грамадскага аб'яднання аховы жывёл «Эгіда»: «Тое, што адбываецца — ЗЛАЧЫНСТВА СТАГОДДЗЯ».**

— Гэта мы тут у Мінску захапляемся Нацыянальнай бібліятэкай, стадыёнамі. А за некалькі кіламетраў ад сталіцы ідуць варварскія расправы з катамі і сабакамі. І льюцца слёзы неабыякавых людзей, і не разумеюць дзеці, якія сталі сведкамі такіх расправаў, што гэта было і як з гэтым жыць... Напрыклад, 5 лютага ў вёсцы Языль (Мінская вобласць) вынішчылі больш як 25 хатніх і бяздомных сабак і катоў. Таксама стралялі. Сцягвалі да сельскага Савета, які размешчаны насупраць школы і дзіцячага садка. Сярод трупаў былі і жывыя, недабітыя жывёлы. Апошніх, тым работнікам, якія грузілі, прапаноўвалі дабіваць малатком... Людзі адмаўляліся і загружалі жывых разам з мёртвымі. Відавочцы кажуць, што дзеці ў гэты час каталіся з гары на лыжах. Пасля таго, як вывезлі сабак, жыхары вёскі засыпалі кроў на снезе... Калі б адстрэлы кантраляваў ветэрынарны ўрач, усё б было, перакакана, па-іншаму. Урач такіх бязлітасных расправаў над жывёламі не дапусціў бы. Для работнікаў жа камунальных службаў сабакі — гэта смецце, ад якога трэба пазбавіцца любым, нават варварскім спосабам.

**Убачыўшы, што сабака жывы, той, хто яго цягнуў, стаў дабіваць ахвяру манціроўкай. Кроў ляцела ва ўсе бакі, а ён біў... Я плакала, маліла застрэліць Валета, каб не мучыўся. У адказ пачула, што страляць пры людзях нельга.**

**Алег САВАСЦЕЙ, начальнік РУУС Стаўбцоўскага райвыканкама: «Трэба змагацца не з сабакамі, а з іх уладальнікамі».**

— Адны сабак падкормліваюць, іншыя скардзяцца, што безнаглядныя сабакі гаўкаюць, кідаюцца на людзей. Тое, што я скажу, наўрад ці спадабаецца прадстаўнікам аб'яднанняў, якія ахоўваюць жывёл, але гэта так. Сёння на адну скаргу на дзеянні работнікаў камунальных службаў паступае 10 званкоў з просьбамі ачысціць вуліцы ад бадзяжных сабак. Апошняя просьба — ад жанчыны з вуліцы 17 Верасня, дзіця якой пакусаў сабака. Брыгада выехала туды і адстрэліла чатырох сабак. Праблема бадзяжных сабак ёсць, я не адмаўляю. Адлоўліваем, а іх менш не становіцца. Але корань гэтай праблемы не ў сабаках, а ў людзях. Апошнія не рэгіструюць сваіх гадаванцаў, адпускаюць гуляць без дагляду. Пра ашыйнікі, павадкі і наморднікі я ўжо маўчу. Парушаюць, а пасля здзіўляюцца, чаму іх сабаку адлавілі. Многія ж бяруць шчаня, а праз нейкі час, нацешыўшыся, выкідваюць на вуліцу. Я згодны, што трэба ствараць часовыя пункты ўтрымання сабак. Падобную прапанову выказваў на планёрцы і санітарны ўрач. Пакуль што ўсё ўпіраецца ў фінансаванне. Цяпер вырашаецца пытанне закупкі ўколаў для ўсыплення сабак.


Фота Надзеі ДРЫЛЫ.

## «Сабака бывае куслівым толькі ад жыцця сабачага»

Да такой высновы прыйшлі мы з Таняй Шараевай, якую ў Бабруйску крыху больш за год таму пакалечыла зграя сабак (жудасную гісторыю 21-гадовай Тані «Звязда» расказала ў мінулую суботу), узгадаўшы песню Сяргея Нікіціна. Калі дзяўчына даведалася, што ў горадзе нарэшце (29 студзеня) адчынілі часовы пункт утрымання бяздомных сабак, вельмі ўзрадавалася. Маўляў, няхай жывуць сабе ў цяпле і сытасці за парканам. Хоць людзі перастануць баяцца выходзіць на вуліцу.

Узрадаваліся адкрыццю часовага прытулку і валанцёры. Штодзень яны прыязджаюць туды, прывозяць кашы і супы для сабак, фатаграфуюць і змяшчаюць фотаздымкі ў гарадской газеце. Верачь, што нехта ўбачыць і забярэ бедалагаў. Яшчэ і месяц не прайшоў з моманту адкрыцця пункта, а ўжо больш як 25 адлоўленых сабак знайшлі новы дом. Аднаго з іх, рыжа-чорнага дварняка, на вачах карэспандэнта «Звязды» забраў Сяргей *(на фота)* з жонкай, якія жывуць у раёне прыватных забудоў.

**На бяздомнага Валета напярэдадні скардзіліся жыхары дома № 37, што на вуліцы Чыгуначнай. Яны слёзна прасілі прыбраць сабаку, які гаўкае і не пускае ў пад'езд.**

— Напярэдадні Новага года памёр наш стары Рэкс, — кажа Сяргей. — І вось днямі ў гарадской газеце ўбачылі сабаку, вельмі падобнага да яго. Вось і вырашылі прыехаць, паглядзець, а раптам гаспадар не знайшоўся. Добра, што ёсць такі часовы прытулак. Не павінны сабакі свабодна разгульваць па вуліцах горада.

І Сяргей расказаў, што чатыры гады таму ратвейлер садраў яго сына з турніка і пачаў грызці. Людзі, якія гэта ўбачылі, адбілі і выклікалі «хуткую». Сабаку адлавілі і расстралялі, а яго гаспадара так і не знайшлі.

— Дзякуй Богу, усё абышлося, — уступае ў размову жонка Сяргея. — Раны зажылі, але сын, зараз яму чатырнаццаць, замкнуўся, дагэтуль баіцца бадзяжных сабак... Па Рэксу ж вельмі сумуе.

Людзі задаволеныя, чаго не скажаш пра кіраўніцтва Бабруйскага спецыялізаванага аўтатранспартнага прадпрыемства, якое ўтрымлівае бадзяжных сабак за свой кошт.

**Анатоль САВЯНКОЎ, дырэктар Бабруйскага спецаўтапрадпрыемства: «Нікому, акрамя нас, гэтыя сабакі не патрэбныя».**

— Грошай на ўтрыманне часовага прытулку ніхто не выдзяляе. Спадзяваліся, наіўныя, што неабыякавыя людзі падтрымаюць нашы пачынанні. Спецыяльна адкрылі дабрачынны рахунак у «Беларусбанку» для ахвяраванняў. Я першы і адзіны, хто паклаў на яго пяць тысяч рублёў. Ніхто, ні ахвяры сабак, ні іх абаронцы, не адшкадавалі ні капейкі. Складаецца такое ўражанне, што дапамога бяздомным жывёлам — пустыя размовы. Нікому яны не патрэбныя ў Бабруйску, акрамя спецаўтапрадпрыемства.

Паводле слоў ветэрынара Аляксандра Драздова, у дзень у Бабруйску адлоўліваюць па тры-чатыры сабакі. І яшчэ ніводнага за месяц існавання часовага прытулку не ўсыпілі.

— Кіраўніцтва спецаўтапрадпрыемства вырашыла, што пакуль усе месцы не будуць занятыя — у адным вальеры (усяго 20) можна ўтрымліваць і некалькі сабак — то ўсыпленне пасля адведзеных правіламі пяці сутак утрымання пакуль не будзе... А наогул мне хочацца звярнуцца да людзей: калі вам не патрэбныя шчаняты, не пашкадуйце грошай і прастэрылізуйце свайго сабаку.

**P.S.** *Пішу, а перад вачыма стаіць пусты правы рукаў Таніная кофтачкі, попельна-русы парык на спінцы стула... Узгадваю, як і сама, ратуючыся ад вясковых сабак, ускідвала ногі на руль веласіпеда і малілася, каб ён не спыніўся. Згодная, што адстрэльваць сабак негуманна. Тым больш на вачах дзяцей. Але і тое, што сабакі важна разгульваюць па пешаходных дарожках, у той час як жанчыны і дзеці абыходзяць іх па снезе, таксама ні ў якія вароты не лезе...*

Зачапіла

# ХТО АДКАЗНЫ ЗА ЛЁС ТАНІ?

Уважліва прачытала матэрыял калегі пра бабруйчанку, якую пакалечыла зграя сабак. За душу ўзяло не толькі напісанае, але і тое, што чытаецца паміж радкамі: стан яе маці, жыццё пасля трагедыі. Жыла сабе жанчына, працавала, старалася, выгадавала дачку. Прыгожую, здаровую, поўную планаў на далейшае жыццё. Вядома ж, і маці ў сваіх марах-меркаваннях уяўляла дачушку ў будучыні гаспадыняй дома, удачлівай жонкай і маці, працаўніком на нейкай вытворчасці або ва ўстанове... Усё перакрэсліла нейкая зграя азвярэлых недарэчных сабак. І цяпер 20-гадовая дзяўчына — без рукі, без здароўя, без ранейшых перспектыў. А хто за гэта адкажа? А як быццам бы няма каму.

Колькі пра гэта пішацца, гаворыцца, а воз, падобна на тое, ніхто і не думае рушыць з мёртвага пункту. Навесці парадак з «сабачым» пытаннем ахвотнікаў не знаходзіцца. Усе спасылаюцца на прарэхі ў законах, на розныя інструкцыі, пастановы, рэзалюцыі, а стан спраў можна вызначыць формулай маскоўскага кіношнага сышчыка: «каманды не было».

Да чаго гэтыя дыскусіі? Бадзяжных сабак у гарадах не павінна быць, і за гэта адказныя пэўныя структуры. Не трэба цяпер заклікаць аўтара да гуманізму, чалавечнасці. Ніхто нікому не забараняе будаваць прытулкі, любіць, лячыць, гадаваць бяздомных жывёлін. Калі ласка. А вось бяздомных іх быць не павінна. А кожны, хто заклікае да эфемернага гуманізму, хай уявіць на месцы Таццяны сваё дзіця без скальпа, у лужыне крыві. Думаю, няма патрэбы працягваць апісваць малюнак. Бяздомныя галодныя сабакі — гэта звяры, якія тояць у сабе небяспеку. Каму гэта незразумела, у таго з разуменнем праблемы. Адсюль павінна будавацца і тактыка работы адпаведных камунальных структур.

Гэта адзін аспект праблемы. Другі — парадак у справе ўтрымання сабак байцоўскіх парод. Правільней, адсутнасць таго самага парадку. Дазвол на ўтрыманне такога сабакі мусіць быць не менен складанай працэдурай, як дазвол на захоўванне зброі. Бо такі звер ніяк не менш небяспечны за зброю. Прыклады знойдуцца ў кожным горадзе, варта ўважліва прагледзець міліцэйскую зводку. У Пінску ўжо сёлета асуджаны два маладыя чалавекі, якія з дапамогай сабакі пітбультэр'ера рабавалі мінакоў каля крамы, адбіралі грошы. А што, нацкаваў сабаку з магутнымі ікламі, і хто хочаш аддасць кашалёк. Яны так і рабілі, 19-гадовы і 20-гадовы пінчукі, потым на «выручаныя» грошы пілі піва, гарэлку. Шчасце яшчэ, што сабака трапіўся міралюбівы, па камандзе хапаў людзей за ногі лапамі, а не кусаў. Наступствы маглі б быць куды больш сур'ёзнымі. Абрабаваныя перажылі моцны стрэс. А нядаўна чытач па тэлефоне расказваў, што ў Брэсце, у раёне Кобрынскага моста, бамжы водзяць аграмаднага сабаку байцоўскай пароды. Што стукне ў галаву гэтым «грамадзянам свету» разам з іх гадаванцам, цяжка ўявіць. Таму міліцыянеры павінны атрымаць права страляць на паражэнне сабаку байцоўскай пароды, які знаходзіцца на вуліцы без намордніка, тым болей без павадка. А што рабіць? Грамадзян трэба выхоўваць зразумелымі ім і дзейснымі метадамі. Нікога ж не вучыць чужы досвед, я маю на ўвазе мінскі выпадак, калі сабака загрыз 5-месячнае дзіця гаспадароў. Аналагічная трагедыя адбылася яшчэ за некалькі гадоў перад гэтым у Іванаве Брэсцкай вобласці. Але суайчыннікі працягваюць разводзіць зверападобных сабак часта проста так, для куражу, каб хваліцца перад знаёмымі альбо бачыць страх на тварах у мінакоў. Апошняе даўно напісана і вытлумачана псіхіятрамі. А ў інтарэсах усіх іншых, каб і гэтыя людзі адчувалі сваю адказнасць.

Дарэчы, паспрыяе выхаванню той самай адказнасці, калі гаспадароў сабак прымусяць прыбіраць за сваімі гадаванцамі, як у Еўропе. А штрафы за невыкананне гэтай нормы якраз могуць пайсці на стварэнне прытулкаў для бяздомных сабак. Хіба ж не гуманна?

Ды вернемся да дзяўчыны з Бабруйска Тані Шараевай. Вядома, адказаць за яе трагедыю павінны канкрэтныя службы і асобы, каб яны і іншыя атрымалі ўрок, каб іншыя нарэшце перасталі сюсюкаць, а заняліся сваімі абавязкамі. Але нават калі некага здымуць з працы, Тані гэтым ужо не дапаможаш.

*Чытаючы пра Таню, я згадвала пра сваю гераіню Вольгу Вацкель з Драгічынскага раёна. У газеце расказала пра яе гісторыю чатыры гады таму. Дзяўчына трапіла пад абарваны провад высакавольтнай лініі. Яна цудам выжыла. Але, як і Таня, засталася без рукі са значна падарваным здароўем. Арганізацыя «Брэстэнерга» не была прамым віноўнікам трагедыі, на бяду паўплываў трагічны збег абставінаў. Але калі такое здарылася з 16-гадовай дзяўчынай, кіраўніцтва «Брэстэнерга» прыняло адзіна правільнае рашэнне, якое дазволіла абысціся з пацярпелай па-чалавечы. За кошт арганізацыі для Вольгі пабудавалі двухпакаёвую кватэру, яе забяспечылі працай і магчымасцю атрымаць адукацыю. Я пра тое, што пры жаданні многае можна зрабіць, калі адчуваеш нейкую хоць ускосную адказнасць за лёс чалавека, і калі маеш спагаду ў сэрцы.* **Цікава, што пра гэта думае мэр Бабруйска, кіраўнікі гарадскога Савета і ЖКГ? Трагедыя здарылася з-за недахопаў у вядзенні гарадской гаспадаркі.**

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Зварот у карпункт

# ЧАМУ ГУРТКІ ДЛЯ МАЛЫХ ПЛАТНЫЯ?

**У карэспандэнцкі пункт «Звязды» па Віцебскай вобласці звярнулася маладая мама з пытаннем: чаму ў дзіцячым садку бяруць плату за заняткі ў гуртках па падрыхтоўцы да школы? Так супала, што раней такое ж пытанне задала і яшчэ адна чытачка. Жанчыны пры гэтым прасілі нумары садкоў не называць, каб, па іх словах, «не было непрыемнасцяў у дзяцей».**

**— Мы штомесяц плацім за знаходжанне дзіцяці ў садку. Выхавацелькі нагадваюць, каб своечасова аплачвалі «за харчаванне». Дык мы плацім толькі за харчаванне? — пытае чытачка, дачка якой першы год ходзіць у садок, — ці яшчэ за заняткі выхавацелек з дзецьмі? Чаму, напрыклад, калі выхавальнік малюе з дзецьмі, за гэта плаціць не трэба, а за заняткі ў гуртку малявання плаціць неабходна? А заняткі па фізкультуры бясплатныя адрозніваюцца ад платных па харэаграфіі толькі таму, што вядзе іх запрошаны спецыяліст? Як і ў выпадку з маляваннем? Няўжо тыя ж выхавацелькі не могуць бясплатна весці заняткі?**

**Яшчэ на жаль, нормай стала добраахвотная-прымусовая матэрыяльная дапамога садку, групе, куды ходзіць дзіця...**

***Па каментарый карэспандэнт «Звязды» звярнуўся ў Віцебскі гарвыканкам.***

Цытую афіцыйны адказ у перакладзе з рускай мовы. Расцэнкі прыведзены на момант падрыхтоўкі адказу.

*«Па інфармацыі аддзела адукацыі Віцебскага гарвыканкама, дадатковыя адукацыйныя паслугі дзецям дашкольнага ўзросту аказваюцца ва ўстановах адукацыі ў парадку, вызначаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Да ліку платных паслуг ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі, адносяцца гурткі па выяўленчым мастацтве, замежнай мове, харэаграфіі, падрыхтоўцы да школы, спартыўныя і іншыя... Сярэдні кошт наведвання аднаго гуртка ў месяц у дашкольных установах складае 12 000 рублёў.*

*Гуртковая работа з дзецьмі дашкольнага ўзросту ва ўстановах пазашкольнага выхавання і навучання можа быць арганізавана толькі на платнай аснове. Кошт платных адукацыйных паслуг зацвярджаецца згодна з разлікам выдаткаў, падаткаў, налічэнняў аддзеламі адукацыі і рэгіструецца ва ўпраўленні антыманапольнай і цэнаснай палітыкі Віцебскага аблвыканкама.*

*На сёння цана наведвання школы ранняга развіцця ў Палацы творчасці дзяцей і моладзі Чыгуначнага раёна (Віцебска. — А.П.) у аб'ёме 8 гадзін складае 15,7 тысячы рублёў. У іншых пазашкольных установах горада ў гэтым годзе платныя паслугі для дзяцей дашкольнага ўзросту не аказваюцца. Вывучаюцца запыты насельніцтва, вырашаюцца арганізацыйныя пытанні».*

Што датычыцца выхавацелек. Думаецца, што не трэба патрабаваць ад іх быць «майстрамі ў розных жанрах». Ну не могуць жа яны адначасова даглядаць дзяцей, выхоўваць іх і паралельна настолькі добра ведаць замежныя мовы, маляваць на прафесійным узроўні ды і харэаграфічнае вучылішча не кожная з іх заканчвала. Пры ўсім тым, што за працу выхавацелькам, на жаль, плацяць мізар. А нагрузкі ў іх і так вялікія.

Чым дашкаляты горшыя за школьнікаў? Пазашкольнае выхаванне і фінансуецца з бюджэту, каб менавіта школьнікі былі занятыя карыснымі справамі пасля вучобы, развівалі свае таленты, займаліся ў гуртках па інтарэсах. У размове з супрацоўнікамі сістэмы пазашкольнай адукацыі карэспандэнт высветліў, што ў апошнія гады бацькі малых дзетак сталі больш увагі надаваць падрыхтоўцы дзетак да школы. І гэта вельмі добра. Таму і тэлефануюць, прыходзяць часта з просьбамі вучыць. Вядома ж, спадзяюцца на бясплатнае навучанне.

Наконт матэрыяльнай дапамогі садкам з боку бацькоў. Тэма, як кажуць, вечная і застаецца адкрытай і ў нашы дні. Колькі разоў ні пісалі пра гэта — нічога не мяняецца. Пазіцыя чыноўнікаў: ніхто не прымушае бацькоў рабіць «узносы» сілай. На пытанні наконт недастатковага фінансавання тых жа садкоў яшчэ да наступлення фінансава-эканамічнага крызісу прыходзілася чуць вельмі доўгія і заблытаныя адказы афіцыйных асобаў. Маўляў, на ежу фінансавання хапае, як і на рамонт дахаў і гэтак далей.

А на так званыя гаспадарчыя патрэбы? Няўжо тыя ж парашок, губкі для мыцця посуду без грашовай дапамогі бацькоў купіць садкі не могуць? Ці рамонт памяшканняў правесці самастойна? Улічваючы, што тэма ў апошні час становіцца ўсё больш рэзананснай (чытачы пішуць лісты ў газеты, а часцей за ўсё скардзяцца адзін другому), думаецца, што яе трэба больш пільна вывучыць на ўзроўні кіраўніцтва міністэрства. Запрашаем да дыскусіі на старонках газеты.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ПРЕДПРИЯТИЯ, НАХОДЯЩЕГОСЯ В ПРОЦЕДУРЕ БАНКРОТСТВА С ЛИКВИДАЦИЕЙ (ЦЕНЫ СНИЖЕНЫ НА 60 %)

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | Расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Городокская, д. 100 А. Объект продается одним лотом.<br>- ремонтные мастерские и административно-бытовой корпус общей площадью **592,4 кв. м**, год постройки ремонтных мастерских 1994; административно-бытового корпуса 2007 г.;<br>- ограждение железобетонное (плиты размером 4х2 м в кол-ве 18 шт., основные средства и оборотные активы согласно перечня, **начальная цена объекта 594 000 000 (Пятьсот девяносто четыре миллиона)** рублей, в т.ч. НДС **99 000 000** (Девяносто девять миллионов) рублей.<br>Решение об отводе земельного участка, пл. 0,2780 га, имеется. Порядок проведения аукциона и подробный перечень имущества оговорен в условиях проведения аукциона.<br>Оплата за объект производится в течение 20 дней со дня проведения аукциона.<br>Задаток 5 % от начальной цены лота перечисляется на р/с 3012203400038 в отделении ОАО «Белагропромбанк» в г. Молодечно код 914, УНП 600077843 ОКПО 05414829, получатель: СУП «МПМК № 197» ОАО «Забудова-строй». Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» № 164 от 02.09.09 г. |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | **09.03.2010 г.** до 16.00, г. Вилейка, ул. Горького, д. 7, кв. 8, управляющий СУП «МПМК № 197» ОАО «Забудова-строй», тел. (8 01771) 5 36 77 (факс), МТС 8 029 578 36 77; vel. 8 029 685 36 77. |
| **Дата, время и место аукциона** | **10.03.2010 г.** в 12.00, г. Молодечно, ул. Городокская, д. 100 А |

Аукцион состоится при наличии не менее двух участников на один лот.

УНП 600077843.


# ПАДАЮЦЬ ЗОРЫ

Бяседныя песні

Гэта на шчасце. Толькі трэба паспець загадаць жаданне — выразна ўявіць яго і акрэсліць межы здзяйснення. Імгненні, імклівыя імгненні даюцца на згадку, одум. І гэткія ж, але ўжо касмічныя, імкненні — на існаванне, жыццё...

Зарапад — гэта не толькі чароўнае відовішча на небе, але і яркі напамін, што дасылаецца нябёсамі, пра хуткаплыннасць жыццёвых з'яў. Усё трэба рабіць своечасова, не адкладваць. Адвагу і сілу для здзяйснення надае любоў, а мужнасць гартуецца каханнем і прасвятляецца ім. Так і ў лірычнай песні, створанай Леанідам Захлеўным і Алесем Бадаком у сярэдзіне мінулага дзесяцігоддзя. Яе назва «Падаюць зоры», якая вынікае з прыпеву, перадае і рамантычную напружанасць пачуццёвых стасункаў між каханкамі, і затоеную драматызаванасць зямной рэчаіснасці, дзе скразная жыццёвая плынь складваецца са шчаслівых і нешчаслівых імгненняў, а імгненне ўвасабляе і акрэслівае ўвесь жыццёвы кругабег.

**ПАДАЮЦЬ ЗОРЫ**

**Верш Алеся БАДАКА Музыка Леаніда ЗАХЛЕЎНАГА**

*Я тваё пацалую далоні,*
*Мне так цяжка было без цябе,*
*Што баюся я нават сягоння*
*І на міг адпускаць ад сябе.*
***Прыпеў:***
*Падаюць зоры, падаюць зоры*
*Ціхай начною парой.*
*Падаюць зоры, падаюць зоры*
*Светлаю стануць расой.*
*Я загадаю ў шчасці і горы*
*Не расставацца з табой.*

*Гавары — буду слухаць да рання*
*І хмялець ад пагляду твайго.*
*Што мы зналі з табой*
*пра каханне*
*Да разлукі у некалькі год?!*
***Прыпеў.***
*Што было — назаўсёды пакіне*
*І растане у зорнай начы,*
*Мы ў мінулае дзверы зачынім*
*І далёка закінем ключы.*
***Прыпеў.***

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**


# ОАО «ВИТЕБСКЛЕС»

**извещает акционеров о проведении очередного общего собрания акционеров 30 марта 2010 года в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 119 А**

**Повестка дня:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году и определение основных направлений деятельности Общества в 2010 году.
2. О результате аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2009 год.
4. Покрытие убытков Общества за 2009 год. О выплате дивидендов за 2009 год.
5. О направлениях использования чистой прибыли Общества в 2010 году и в 1 квартале 2011 года.
6. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
7. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
8. Об увеличении Уставного фонда Общества.
9. Об утверждении решения о выпуске дополнительных акций.
10. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Витебск, ул. Ленинградская, 119 А, приемная) в рабочие дни в период с 20 марта по 29 марта 2010 года с 9.00 до 16.30, а в день проведения собрания — по месту его проведения.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 1 марта 2010 года.

Регистрация участников собрания проводится с 9.30 до 10.45 по месту проведения собрания. Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность, а представителям акционеров — и доверенность.

**Справки по тел. (8 0212) 36 51 25.**

УНП 300029146 Наблюдательный совет ОАО «Витебсклес».





## «АДНА БАБА СКАЗАЛА»

Быў час, калі слава пра наш калгас грымела на ўвесь раён. Бо мільянер... Прычым, як вы разумееце, па савецкіх грашах...

Таму і працаваць сюды прыязджалі не толькі з іншых больш далёкіх вёсак, але і з райцэнтра.

Прыязджалі, як правіла, на адным жлобінскім аўтобусе, па дарозе гаманілі — ды пра што давядзецца. У той раз — пра Томку, якая з нагоды і без любіла «госці рабіць», збіраць сваякоў, сяброў. Яе права. Але ж Яўсееўне, нашай бухгалтарцы, свае тры грошы ўваткнуць трэба, сказаць:

— Ат, можна падумаць, што Томка каго людскага збярэ — прыдуркаў рагачоўскіх... Аліка з яго сям...

І асеклася, прыкусіла язык, успомніла, што Алік — блізкі сваяк Навумавіча, які сядзіць побач і ўсё гэта чуе. Мала таго — ён калгасны эканаміст і яе ж непасрэдны начальнік!

Чакала, што ён нешта адкажа...

Не — прамаўчаў.

Чакала, што распачне «рэпрэсіі» аж да звальнення. Не, ён — (выглядала на тое) нават не думаў... Значыць, пранесла?!

Ці не акрыленая гэтым, Яўсееўна яшчэ раз наступіла на тыя ж самыя граблі, калі адзін з яе стрыечных братоў, якім яна дужа ганарылася (не апошні чалавек... І дзе? У Гомелі!) жаніў свайго сына, ладзіў вяселле і запрасіў яе. Зразумела ж, паехала — не магла не паехаць.

А там...

Ну не спадабалася Яўсееўне новая братава радня! Канкрэтна? Яго нявестка (чытай нявеста), яе бацькі, дзядзькі... Значыць трэба пра гэта сказаць — хоць каму і тут жа. Азірнулася, убачыла жонку другога стрыечнага брата, стала даводзіць (ёй, услых, пры іншых!):

— Ва-а-ля, ну нешта ж нашаму Сашу лепшай дзеўкі не было?.. І сям'і? Гэта ж, ты паглядзі, адны квазімоды — грыбатыя, насатыя... Усе, як на падбор!.. І Сашава жонка такая ж. Цяпер яе падчапурылі, падмалявалі крыху, а распранецца, твар памые... Ну куды ж вы глядзелі, га? Чаму не казалі яму нічога?

Валя зачырванелася, прашаптала:

— Прабачце, мне трэба сысці... Вы пагаварыце тут...

Яўсееўне, аднак, болей гаварыць не хацелася, бо сваячка, якая маналог гэты чула, шматзначна пакруціла пальцам ля ўласнай скроні, сказала ёй:

— Ну ты зусім... Са сваім языком... Сашка ж Валіну пляменніцу бярэ! Родную...

Пагана стала беднай Яўсееўне, нават дужа пагана — не да вяселля: сабрала манаткі і тут жа з'ехала — па-англійску, не адвітаўшыся.

Але ж брат той, як быццам, не пакрыўдзіўся? Ці можа не прачуў яшчэ яе меркавання пра новых сваякоў?

...Яны, як сведчыць жыццё, могуць быць рознымі: падабацца іншым, альбо наадварот, але пры гэтым паводзіць сябе цалкам прыстойна, інтэлігентна. І не зважаць на тое, што пра іх «адна баба сказала».

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

## ХТО ДАПАМОЖА? ПУШКІН!

Кнігі сённяшнія падлеткі чытаць не любяць — увогуле. А ўжо класіку ды з абавязковага спіса літаратуры...

Але ж балы для атэстата, нідзе не дзенешся, зарабляць трэба — хоць якім спосабам. Прынамсі, мая суседка сабрала для сына багатую фільматэку з карцін, знятых па знакамітых творах — ад «Вія» да «Чорнага замка Альшанскага», патлумачыла: «Будзе хоць ведаць, пра што кніга».

А вось з «...Анегіным» ёй не пашанцавала: не звярнула ўвагі, што кінастужку знялі англічане з амерыканцамі. Паглядзела, што ў іх атрымалася — аж вусцішна стала. Ну па-першае (дзялілася потым), героі размаўляюць прозай, па-другое, замест прыгожых краявідаў, нейкія лясныя сметнікі. Па-трэцяе, сама Таццяна — больш нагадвае баскетбалістку, а не сціплую правінцыйную паненку! Да таго ж уяві сабе, — сцішыла голас мая суседка, — яны знялі яшчэ і сцэну ў ложку!.. Ну як каго з кім? Таццяны... З генералам...

Карацей — завяршыла яна — прышлю да цябе свайго лайдака — пазычыш яму «...Анегіна».

Увечары той лайдак — з касою грыўкай, ростам з дзвярны вушак — ужо стаяў у нашай вітальні, цярпліва чакаў, пакуль я дастану з кніжных паліц свой патрапаны томік паэм. «Можа яшчэ што з Пушкіна даць?» — спыталася я. «Не», — матнулася доўгая пасма. — Мне толькі «... Анегіна»: ліст ну гэтай, ціпа жанчыны вывучыць трэба... Русіца абяцала дзявятку паставіць...».

Дні праз два я выпадкова сустрэла хлопца ў двары, спытала, як яму той ліст і тая «ціпа жанчына» — дапамагла атрымаць дзявятку? А можа, — пажартавала, — зацікавіла цябе, падбіла пачытаць далей — хоць бы да дуэлі з Ленскім? «Ваў! — прысвіснуў юнак, — а яны што — страляліся? Да смерці?.. Яны ж гэта... Ціпа пасябравалі?.. Няўжо з-за чувіхі?!»

...Адказ на гэтае пытанне мой сусед знайшоў, відаць, сам? Бо кнігу вярнуў з удзячнасцю. Нават меркаванне сваё пакінуў: «Ну напісана, увогуле класна, нічога не скажаш! Але незразумела, навошта?.. Ну хіба што... Я за Пушкіна дзесяць балаў атрымаў. Русіца запытала, хто дачытаў паэму да канца? Я ў класе быў другі...».

**Святлана Багер,** *г. Гродна.*

## ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

Пра што, сабраўшыся гуртам, вядуць размову жанчыны, не ведаю. Мужыкі ж, як правіла — мае аднакласнікі не выключэнне — абмяркоўваюць сусветную палітыку, аўтамабілі, поспехі ў рыбалцы-паляванні і, абавязкова, успомняць службу ў войску.

...Раней яна, гэтая служба, магла закінуць прызыўніка куды заўгодна — ад Ціхага акіяна да Брэста і далей у краіны Варшаўскага дагавора.

Адзін з нашых, прынамсі, служыў у Казахстане, і было ў іхняй роце два Уладзіміры. Адзін — кандыдат у майстры спорту па цяжкай атлетыцы, спакайняк, здаравяк, тугадум. Другі — поўная супрацьлегласць — прыкаліст, як цяпер сказалі б. Пасля школы ён скончыў ветэрынарны тэхнікум, відаць, таму служыць яго накіравалі ў медсанчасць.

Як і варта было чакаць, лёс звёў іх: падчас заняткаў на палігоне Уладзіміра першага ўкусіла нейкая павукападобная істота, і яго адразу ж накіравалі ў санчасць — да Уладзіміра другога.

Колькі ён там прабыў, але вярнуўся дужа задуменны, сядзеў асабняком.

А сябры ж не маўчалі, яны распытвалі, што там было, як? І маўчун здаўся, чэшучы «рэпу» сказаў:

— Ну рану мне там апрацавалі, — разумею, гэта трэба. Ну ўкол у мяккае месца ўшпілілі — таксама... А вось навошта было машонку зялёнкай вымазваць, ёсць пытанне...

Дружны рогат у 20 салдацкіх глотак быў адказам.

**Валерый Гаўрыш,**
*в. Навасёлкі-1, Пастаўскі раён.*

## КАЛЬЕ ДЛЯ МАЛОДШАЙ ЖОНКІ

Пазамінулым летам мы з мужам ездзілі ў Прагу, у горад, які называюць музеем пад адкрытым небам. Бо там і насамрэч што ні дом, то цуд і помнік дойлідства. А ўжо касцёлы, цэрквы, замкі... З усяго свету людзі едуць, каб на іх паглядзець!..

І, як гэта ні дзіўна, там усіх: сустракаюць-праводзяць, размяшчаюць у прыстойных гасцініцах, возяць па экскурсіях, смачна і без праблем могуць накарміць... Дзеля гэтага адкрыта мноства вялікіх і маленькіх крамаў, кавярняў, рэстаранаў — пераважна з утульнымі верандамі, якія выходзяць проста на вуліцы і плошчы. І калі ты сядзіш там (з усімі і сам-насам) — з куфлем піва або з кубачкам кавы...

Уражанні проста незабыўныя!

А расказаць хачу пра адно — смешнае.

То ў першы ж дзень мы нахадзіліся па горадзе, наглядзеліся. Забрылі ў кавярню (яны там на кожным кроку, лічы), занялі столік у куце. А паводдаль — бачым — кампанія сядзіць — пяць мужчын, пяць жанчын. І досыць сталыя, вясёлыя.... «Не нашы?» — цікавіцца муж. «Не, — кажу, — бо ў нас жа не бывае, каб пяць на пяць, у нас — мужчын меней — на дзве-тры «адзінкі».

Гэта мы ведаем не па чутках, — па сваіх сябрах, дакладней сяброўках. Адна з іх замуж выйшла ў 30 з вялікім хвастом, другая — не была наогул (маці-адзіночка), трэцяя — удава... А мужчына, як ні круці, патрэбен — параіцца, мех бульбы з крамы прывезці, мэблю пераставіць...

Каму часцей, каму радзей, кожнай з гэтых жанчын дапамагаў муж. І кожную (цяпер не ўспомніць ужо, з чыёй падачы?) жартам называў жонкай — другой, старэйшай, малодшай...

У Празе ён быў са мной, з законнай. Але ж іншых успамінаў таксама. Напрыклад, зайшлі ў краму паглядзець сувеніры, а там розных калье, бранзалетак, пацерак, пярсцёнкаў...

— Можа, табе купіць што? — пытаецца муж.

— Не, — кажу. — Ты ж ведаеш: я не аматарка... А вось каб твая малодшая жонка ды тут была... Адарвалася б, скажы?..

— Ну-у, — заўсміхаўся муж, — «цёця ёлка» не прамінула б, намяла б... Ніякіх грошай не хапіла б...

Гаварылі мы так паміж сабой, але, як высветлілася, побач яшчэ адны вушы былі:

— Простите, а вы откуда приехали? — акругліўшы вочы, па-руску спытала ў нас адна з прадавачак.

— З Мінска.

— Быть того не может! В Беларуси что — теперь многоженство?!

— А вы што — не ведалі? — (жартаваць дык жартаваць!) здзівіўся мой. — І даўно ўжо... Кожны мужчына ў нас мае столькі жонак, колькі можа забяспечваць... У мяне вось чатыры.

— И что? — з цяжкасцю знаходзячы словы, ужо да мяне звярнулася прадавачка, — вас, как женщину, как жену вот это устраивает?! Вы все это терпите?!

— А чаму б і не? — пацiснула плячыма я (трэба ж падыграць мужу).

Цяжка апісаць рэакцыю жанчыны. Ад абурэння яна, як моладзь кажа, «выпала ў асадак», пачала казаць, што свайму мужу ніколі ў жыцці не дазволіла б нічога нават блізка падобнага, што ніколі ў жыцці сама не пацярпела б такой знявагі і ніколі б не падумала, што так «низко сможет пасть Беларусь»...

Што-што, аўтарытэт краіны і яе людзей трэба было ратаваць, прычым — тэрмінова: пырснуўшы ад смеху, мы сказалі жанчыне праўду... І пачулі потым (ад душы нарагатаўшыся), што яна таксама крыху беларуска, карані — пад Смаленскам. А ў Празе — замужам, за чэхам, які сяброўак яе ў госці яшчэ прымае, а каб нечым дапамагаць — не.

Гэта, мусіць, наша, чыста нацыянальнае?

**А. Каленік,** *г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

# АРТЫКУЛ У ЮБІЛЕЙНЫ НУМАР, АБО СПРЭЧКА З МІНІСТРАМ

**Сёння былому журналісту-звяздоўцу Вячаславу Вольскаму спаўняецца 75 гадоў. Амаль дваццаць з іх ён прысвяціў працы ў «Звяздзе». Многія з яго нарысаў і фельетонаў, якія друкаваліся на старонках газеты, потым выйшлі ў выдавецтве асобнымі кнігамі і брашурамі: «Замежная камандзіроўка», «Каралеўская вячэра», «Фірма венікаў не вяжа» і інш.**

**Калектыў звяздоўцаў шчыра зычыць юбіляру моцнага здароўя і новых творчых поспехаў на журналісцкім шляху. Змяшчаем адзін з успамінаў Вячаслава Вольскага, які непасрэдна звязаны з яго працай у «Звяздзе».**

Пэўны час міністрам замежных спраў Беларускай ССР быў Анатоль Емяльянавіч Гурыновіч. Яго паважалі ў калектыве і паміж сабою дыпламаты называлі проста «Гура». «Гура» сказаў, «Гура» зрабіў заўвагу, «Гура» ўчыніў разнос. Высокі і сімпатычны мужчына з ледзь прыглушаным голасам, ён выклікаў давер у суразмоўцаў. Між іншым, «Гура» меў і пачуццё гумару. Калі на сесіі Генеральнай Асамблеі ААН беларуская дэлегацыя давала прыём, дзе звычайна частавала гасцей — прадстаўнікоў амаль 150 краін планеты — белавежскай гарэлкай і белымі грыбамі-баравічкамі і, вядома ж, іншымі прысмакамі нашай нацыянальнай кухні, Гура жартам даваў наказ падначаленым: «Прасачыце, каб на сталах стаяў хрэн. Каб госці пасля не сказалі, што на стале ні храна не было».

І ўсё ж Гурыновіч быў вельмі асцярожным міністрам і дыпламатам. Ён, як кажуць, не высоўваўся, не лез папярод бацькі, якім у той час быў наш зямляк Андрэй Грамыка, і строга сачыў за тым, каб не дапусціць пракол у рабоце міністэрства. Я ў гэтым пераканаўся на ўласным вопыце.

Кожны год пасля сесіі Генеральнай асамблеі ААН я як загадчык міжнароднага аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» павінен быў рыхтаваць да друку артыкул А. Гурыновіча (перакладаць з рускай мовы на беларускую і рабіць яго больш зразумелым для чытачоў). Я заўсёды сутыкаўся з адной і той жа цягамоцінай, з якой нельга было зразумець, чым жа тры месяцы (тэрмін пасяджэнняў сесіі) у Нью-Ёрку займалася наша дэлегацыя дыпламатаў на чале з міністрам: якую істотную прапанову яна ўнесла на разгляд гэтага вялікага форуму і які вынік яе абмеркавання? Такія артыкулы міністра займалі палову газетнай старонкі, але ўсё ў іх было нібы ў тумане. Звычайны чытач да сутнасці не мог дакапацца, колькі б ён ні сіліўся.

Аднойчы я вырашыў «ажывіць» артыкул міністра. Было гэта ў юбілейным годзе (1972) з дня ўтварэння СССР. Рэдкалегія «Звязды» зацвердзіла маю прапанову каб Гурыновіч выступіў з артыкулам, прысвечаным юбілею, на тэму радка з верша Янкі Купалы: «Занімай, Беларусь дарагая мая, свой пачэсны пасад між народамі». На гэты раз артыкул заказваў Гурыновічу рэдактар, Міхаіл Іванавіч Дзялец. І калі мне на стол паклаў артыкул памочнік міністра, мой добры сябра Міхаіл Калошын, дык я заўважыў, што артыкул быў наогул без загалоўка. На маё пытанне: «Чаму артыкул без назвы?» Калошын адказаў коратка: «А хіба ты не ведаеш, што начальства не любіць ламаць галаву над нейкімі мудрагелістымі загалоўкамі? Яно гэта пакідае вам, журналістам». Мне ж таксама ламаць галаву на гэты раз не давялося, бо радок з верша Янкі Купалы быў зацверджаны рэдакцыяй, і таму я яго акуратна напісаў над артыкулам Гурыновіча. А пасля, калі я стаў рыхтаваць яго да друку, дык мяне здзівіла яшчэ адна акалічнасць: у артыкуле не было той самай важнай і канкрэтнай беларускай прапановы, якая была прынятая Генасамблеяй ААН. Гаворка ішла аб тым, каб судзіць фашысцкіх ваенных злачынцаў у тых краінах, дзе яны ўчынілі свае злачынствы, і без тэрміну даўнасці.

Крыху паразважаўшы, я зразумеў, чаму міністр абмінуў гэты вельмі важны тэзіс за ўсе папярэднія 25 гадоў работы беларускай дэлегацыі ў ААН. Ды таму, што гэта было яшчэ пры міністры Кузьме Кісялёве, які ўзначальваў МЗС Беларускай ССР да Гурыновіча. Таму, каб не варушыць старое, лепш яго проста абысці маўчаннем, што і зрабіў Гурыновіч.

Праўда, трэба зазначыць, што ў гады «халоднай вайны» ў нашых дыпламатаў работы на ідэалагічным фронце змагання супраць імперыялістаў розных рангаў было, як кажуць, вышэй даху. Трэба было высмоктваць з пальца так званыя «адлупы» з прычыны падаўлення «Пражскай вясны», ці то польскай «Салідарнасці», ці то ўвод савецкіх вайсковых фарміраванняў у Афганістан, а кубінскіх у Анголу...

Але вернемся да артыкула Гурыновіча. Калі ён быў падрыхтаваны да друку з упісаным мною тэзісам наконт суда над фашысцкімі ваеннымі злачынцамі і загалоўкам з верша Янкі Купалы, я прывёз яго ў МЗС на візу да Анатоля Гурыновіча. Той доўга і моўчкі яго чытаў. І чым далей ён паглыбляўся ў тэкст, тым ад таго прыветлівага настрою, з якім ён сустрэў мяне, на яго твары, увогуле прыгожым і гладка паголеным, не заставалася і следу. Ён усё больш і больш станавіўся змучаным. Я адчуваў, што ён незадаволены сваім артыкулам. І здагадваўся, у чым прычына: у тэзісе Кузьмы Кісялёва, які я ўставіў самачынна, без узгаднення з ім. Аднак сказаць мне, каб я яго сам і выкрасліў, ён не рашаўся, бо было б вельмі дзіўна і падазрона: чаму ў такім выніковым артыкуле, апублікаваным у святочным нумары, не згаданы найважнейшы тэзіс усёй беларускай дыпламатыі?

Толькі неяк ціха і дыпламатычна Гурыновіч мне зрабіў заўвагу, што, маўляў, гэты тэзіс мы і так вельмі часта асвятлялі ў друку, і таму ён вырашыў тут абысціся без прапановы Кузьмы Кісялёва. Пры гэтым імя яго папярэдніка «Кузьма» было вымаўлена Гурыновічам з адценнем пагарды і ў расцяжку «Кузь-мы-ы». Я не ведаў, якія былі адносіны ў Гурыновіча з яго былым шэфам, але ўжо гэта адна фраза сведчыла аб тым, што не вельмі прыязныя. Увогуле іншымі яны не маглі быць, бо калі ўлічыць той вялікі тэрмін, які Кузьма Кісялёў сядзеў у міністэрскім крэсле, што нават даслужыўся да пасады дуаена Генасамблеі, дык можна ўявіць, колькі гадоў малады дыпламат Гурыновіч, будучы яго намеснікам, чакаў міністэрскай пасады.

На гэту заўвагу Гурыновіча я з затрымкай запярэчыў: «Але ж, Анатоль Емяльянавіч, гэты артыкул не звычайны, а для юбілейнага нумара газеты — паўвека з дня стварэння вялікага Саюза, таму тут усе дасягненні павінны быць улічаны». Міністр прамаўчаў, але стаў доўга задумвацца ўжо паўторна над загалоўкам артыкула. І тут нечакана ўстаў, падышоў да шафы, узяў адтуль том слоўніка рускай мовы Даля, вярнуўся ў сваё крэсла і пачаў там шукаць нейкае слова. Я моўчкі назіраў за яго дзеяннямі. Ён таксама моўчкі гартаў старонкі слоўніка. Нарэшце спыніў свой пошук і стаў уголас чытаць тлумачэнне Даля слова «пасад» — «место за городской чертой, где сидели купцы и ремесленники». «А мы на сесіі Генасамблеі сядзім разам з усімі дэлегацыямі, а не за нейкай там «чертой», — ужо задаволены сабою (хоць тут ён адыграўся) прамовіў Гурыновіч. Мне не заставалася нічога, як абараняць паэтычны радок Янкі Купалы, у якім слова «пасад» мела зусім іншы сэнс, не купецкі і не рамесніцкі, а аднолькавае месца сярод роўных краін. Да таго ж перад словам «пасад» стаіць слова «пачэсны».

Гурыновіч настойваў на сваім, маўляў, Янка Купала — паэт, ён мог гаварыць і пісаць усё, што яму прыйдзе ў галаву, а ў нас, у дыпламатаў, усё павінна адпавядаць канкрэтнаму сэнсу, каб не было ніякіх крыватолкаў.

Я адчуў, што далей працягваць спрэчку з міністрам было б занадта з майго боку, таму на развітанне паабяцаў яму, што яго думку наконт загалоўка я паведамлю рэдактару.

Я так і зрабіў, на што Міхаіл Іванавіч з усмешкай прамовіў: «Міністр што, не любіць паэзію Янкі Купалы?».

Артыкул Гурыновіча так і быў апублікаваны ў «Звяздзе» пад загалоўкам з верша вялікага песняра.

**Вячаслаў ВОЛЬСКІ.**

## ЛЕПШ БЫ ТЫ ПАСПАЎ ДОМА...

**Бліжэй да апоўначы работнікі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі ў лясным масіве на тэрыторыі Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка "Навагрудскі" каля вёскі Малыя Карнашы ўбачылі аўтамашыну "Пежо-406", у якой спаў мужчына ў камуфляжным адзенні.**

Прайшоўшы па слядах машыны, рэйдавая група затрымала паблізу двух грамадзян, побач з якімі ў снезе былі знойдзены чахол ад стрэльбы і патрон 12 калібру з куляй. Падчас арганізаваных пошукаў у лесе былі знойдзены дзве адзінкі паляўнічай зброі, заплечнік з ляміпай-фарай і акумулятарам, паляўнічы нож. Была ўстаноўлена і прыналежнасць да незаконнага палявання на тэрыторыі заказніка грамадзяніна, што спаў у машыне.

## ДЗІК З-ПАД СНЕГУ ДЛЯ ШАСЦЯРЫХ

**Позна ўвечары ў Расонскую міжрайінспекцыю паведамілі, што ў паляўнічых угоддзях паблізу вёскі Грышына знойдзена прысыпаная снегам туша дзіка.**

Ранкам наступнага дня ў гэтым месцы пасля пагрузкі тушы ў аўтамашыну ГАЗ-66, што належала ААТ «Полацклес», дзяржінспектары затрымалі шэсць рабочых Маласітнянскага лесапункта названай гаспадаркі.

Рэйдавай групай Полацкай міжрайінспекцыі затрыманы ляснік Полацкага лясгаса, які каля вёскі Касары незаконна здабыў казулю з трыма эмбрыёнамі, чым нанёс прыродзе шкоду ў асабліва буйным памеры. Службовая стрэльба з патронамі і мяса канфіскаваныя.

Работнікі Салігорскай міжрайінспекцыі паблізу вёскі Вялічкавічы затрымалі аўтамабіль «Фальксваген-Джэта», з выкарыстаннем якога вялося незаконнае паляванне ў начны час на тэрыторыі Старобінскага лясгаса. У машыне быў вадзіцель названай гаспадаркі, яго сын і яшчэ два чалавекі. Канфіскавана незарэгістраваная паляўнічая стрэльба, патроны і фара-шукальнік. Аўтамабіль арыштаваны і накіраваны на штрафстаянку Салігорскага РАУС.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЖАРСЦІ ПА «ЕЎРАБАЧАННІ»: *выбіраць трэба нумар, песню ці артыста?*

У гэтым годзе беларусы пазбаўлены прывычнага ўжо драйву доўга і пільна сачыць за працэсам адбору, раскрываць закулісныя таямніцы, строіць здагадкі і рабіць стаўкі, каму ўсё ж пашанцуе. Прызначана валявым рашэннем фокус-групы, сабранай з прадстаўнікоў вядучых тэлеканалаў: абраны гурт «Тры плюс два» — і ўсё, змірыцеся, няўдачнікі, сціхніце, зайздроснікі, супакойцеся, крытыкі, ад вас тут ужо нічога не залежыць, разнявольцеся і паспрабуйце атрымаць задавальненне.

Але той факт, што мы не можам паўплываць на ход падзей, зусім не значыць, што нам няма чаго сказаць з гэтай нагоды. Памятаеце ж — у музыцы, спорце і ахове здароўя ўсе пагалоўна спецыялісты. Зрэшты, найбольшую вагу маюць усё ж меркаванні менавіта спецыялістаў — прафесійных выканаўцаў, спрактыкаваных музычных і тэлевізійных прадзюсараў. Днямі, літаральна за пару гадзін да абвяшчэння сёлетніх беларускіх удзельнікаў «Еўрабачання», прадстаўнікі шоу-бізнэсу абмяркоўвалі за «круглым сталом», чаго ж нам не хапае для перамогі і на што трэба рабіць акцэнт пры выбары «музычных паслоў».

Рэжысёр і прадзюсар **Уладзімір МАКСІМКАЎ** — бадай адзіны ў Беларусі чалавек, хто паабяцаў «адказаць за Еўрабачанне» і выканаў абяцанне, пакінуўшы пасаду генеральнага прадзюсара Першага канала ў 2004 годзе, пасля не вельмі ўдалага выступлення дуэта «Аляксандра і Канстанцін». З іншага боку, гэта быў увогуле дэбют Беларусі на конкурсе — так бы мовіць, прасяканне акна. «На мой погляд, трэба зразумець, чаго краіна хоча ад гэтага конкурсу — вынік або ўдзел у працэсе, — разважае Максімкаў. — Калі вынік — трэба наймаць Кіркорава, міжнародную каманду... Але мне здаецца, што гэта няправільна. «Еўрабачанне» — гэта камерцыйны праект, ЕВС на ім зарабляе каласальныя грошы з унёскаў краін-удзельніц, і большасць краін выкарыстоўваюць яго менавіта такім чынам — унутры краіны ладзяць вялікае шоу, на якім таксама зарабляюць грошы. Трэба і нам вучыцца рабіць бізнэс на тэлевізійным праекце. Бо я не згодны, што гэта конкурс песні — ён увогуле мае вельмі далёкае дачыненне да музыкі». Так што галоўным пры падрыхтоўцы, мяркуе рэжысёр, павінен быць зусім не артыст і не ягоны прадзюсар, а менеджар, які разумее прынцыпы бізнэсу. «Я даўно прапаноўваў прадаваць месца ўдзельніка з аўкцыёну!» — шакіраваў ён калегаў.

**Аляксандр ЦІХАНОВІЧ**, кіраўнік праекта «Еўра-Фэст», у фармаце якога тры гады запар праходзіў нацыянальны адбор, прапагандуе ўсё ж творчы падыход, але перакананы, што выбіраць выканаўцу трэба не ўсенародна — «узгадайце, да чаго гэта прывяло летась», — а з дапамогай прафесійнага журы, і абавязкова пасля жывога праслухоўвання ўдзельнікаў, а не па гатовай фанаграме песні: «Нездарма ў Расіі таксама прыйшлі да такога прынцыпу, да жывога праслухоўвання ўсіх прэтэндэнтаў».

**Максім АЛЕЙНІКАЎ**, прадзюсар неўміручага гурта «Топлес», вядомы не толькі прыбытковымі хітамі, але і ўласным вострым языком. Не змаўчаў ён і ў гэты раз: «Хто б ні выбіраў — адзін год так, другі гэтак, а выніку як не было, так і няма, толькі робім розных людзей вінаватымі. З майго пункту гледжання, поспех на «Еўрабачанні» — гэта ў першую чаргу: а) песня, б) выканаўца з песняй павінен быць максімальна гарманічны. Адпаведна, спецыялісты, якія прымаюць рашэнне, павінны быць спецыялістамі па песнях. Прааналізуйце — у 80, а то і 90 працэнтаў пераможцаў песня была адной з самых удалых на конкурсе!».

Прадзюсар Ані Шаркуновай і Германа **Уладзімір КУБЫШКІН** настойвае на іншым падыходзе: «Я ўпэўнены на сто адсоткаў, што дрэнны артыст сапсуе нават самую добрую песню. Таму выбіраць трэба менавіта артыста, прафесійнага, харызматычнага і г.д. Мы блытаем тры існуючыя паралельна, незалежныя адна ад адной рэчы — тэлешоу, конкурс і дзяржаўны інтарэс. А кожную пазіцыю трэба разглядаць асобна, і не ператвараць шоу ў конкурс маладых выканаўцаў. І яшчэ варта разумець, на які каэфіцыент карыснага дзеяння ты разлічваеш: навошта ехаць на конкурс і потым вяртацца ў Беларусь з падціснутым хвастом, калі няма далейшай «маскоўскай гісторыі», і ты згубіў нават тыя пазіцыі, якія меў раней? Навошта ўвогуле перамагаць?». — «Спачатку трэба перамагчы, — парыраваў Максім Алейнікаў, — а потым так разважаць».

Уладальнік самага высокага на сёння — 6-га месца Беларусі на «Еўрабачанні» **Дзмітрый КАЛДУН** не ўдзельнічаў у спрэчках, хто ў камандзе павінен быць галоўным і ці існуе ўніверсальная формула поспеху для беларусаў. Затое падзяліўся ўласным вопытам, дзеля чаго ўвогуле варта ехаць на конкурс: «Павінна быць матывацыя — прадзюсара, які настроены пасля раскруткі зарабіць грошы, арганізатараў — Белтэлерадыёкампанія таксама ўкладвала мноства грошай і сілаў у падрыхтоўку, артыстычная — як было ў маім выпадку, калі я застаўся без прадзюсара і трэба было абавязкова штосьці зрабіць, каб не застацца ні з чым. Сукупнасць гэтых стымулаў вылілася ў тое, што ў нас камандай атрымалася дасягнуць такога выніку». Дзіму, дарэчы, сёлета прапаноўвалі ехаць на «Еўрабачанне» зноў — ад Расіі, але ён адразу адмовіўся: «Для мяне гэта прынцыповае пытанне, ні ад якой іншай краіны я туды не паеду. Дый песня стылістычна мне не падыходзіла — можа, у выкананні іншага артыста яна і стала б хітом, але асабіста мне не пасавала. Дарэчы, што датычыцца песні, абранай ад Беларусі — на мой погляд, тут таксама ёсць нейкая нестасоўка з артыстамі, магутнасці для такой музыкі ім крыху не хапае; і мне падалося, што гэта ўсё ўжо недзе было...».

Спявачка **ГЮНЕШ**, якая пяць гадоў штурмуе нацыянальны адбор, падкрэслівае, што ў яе і песня «правільная», і матывацыі, творчых амбіцый хапае, таму рукі апускаць яна не збіраецца: «Калі іх абралі — значыць, так трэба, і на конкурс трэба ехаць з памкненнем перамагаць. Што да мяне — я за пяць гадоў паказала, што магу працаваць у розных кірунках, і я гатовая выступіць за сваю краіну, Рэспубліку Беларусь, на «Еўрабачанні».

## ТРЫ ПЫТАННІ НАЎЗДАГОН

***— Дзе яшчэ, акрамя Беларусі, выкарыстоўваўся сёлета закрыты адбор?***

Унутраны адбор — г.зн. арганізатары проста агучвалі імя выканаўцы, не тлумачачы прычыны свайго рашэння — прайшоў ва Украіне, Францыі, Бельгіі, Грузіі, Балгарыі і Швейцарыі. Некаторыя краіны выбіралі адразу выканаўцу і песню, некаторыя зладзілі дадаткова конкурс на лепшую песню з галасаваннем гледачоў і журы.

***— А суддзі хто?***

Як стала вядома днямі, у фокус-групу, створаную арганізатарам нацыянальнага адбору — Белтэлерадыёкампаніяй, увайшлі прадстаўнікі чатырох тэлеканалаў: ад Першага — галоўны дырэктар галоўнай дырэкцыі Аляксандр Капёнкін і выканаўчы прадзюсар Антон Піменаў, ад «ЛАДа» — выканаўчы прадзюсар Глеб Шульман, ад АНТ — першы намеснік старшыні праўлення Сяргей Хоміч і кіраўнік дырэкцыі спецпраектаў Анжэліна Мікульская, ад СТБ — намеснік гендырэктара Павел Каранеўскі і кіраўнік праграмнай дырэкцыі Таццяна Стаселька.

***— Хто ж цяпер зоймецца падрыхтоўкай гурта «Тры плюс два» — АНТ ці Белтэлерадыёкампанія?***

Гурт насамрэч ужо няблага падрыхтаваны — акрамя арыгінальнай версіі песні «Far away», артысты запісалі ў Кіеўскай студыі беларуска- і рускамоўныя варыянты, таксама з падачы АНТ ужо зняты кліп на конкурсную кампазіцыю. Больш падрабязна аб тым, як будзе ісці працэс падрыхтоўкі (да конкурсу, нагадаем, засталося ўсяго 2,5 месяца), кіраўнікі тэлеканалаў абяцаюць расказаць на наступным тыдні.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## ЗЛОДЗЕЯ ВЫДАЎ ЗВАНОК...

**Калі зладзюжка спрабаваў «спіхнуць» з рук крадзены сотавы тэлефон, апошні зазваніў, і перапалоханы прадавец кінуўся наўцёкі.**

Няўдалая спроба збыць «прыхватызаваны» мабільнік — далёка не першы «хіб» крымінальніка, які, як выявілася, арудаваў ля аўтамабіляў па дастаўцы тавару ў крамы. Паводле звестак прэс-афіцэра Партызанскага РУУС Андрэя Сасонкі, менавіта гэтыя машыны трапілі ў поле зроку падазронага, таму што кіроўцы часта пакідалі транспарт незамкнутым. У прыватнасці, у адным выпадку пацярпеў кіроўца «ЗІЛа», які па віне згаданага злодзея страціў маёмасці на 700 тысяч рублёў, у другім — кіроўца «Хонды», якога «абчысцілі» на два з паловай мільёны рублёў. Трэцяй ахвярай стаў кіроўца мікрааўтобуса, з якога правераным спосабам аўтазлодзей «канфіскаваў» мабільнік. Каб прадаць рэч, ён накіраваўся на адзін са сталічных рынкаў, дзе, як кажуць, і апраставалосіўся. Калі патэнцыйны пакупнік разглядаў сотавік, тэлефон зазваніў. Не чакаючы такога падвоху злачынца разгубіўся і ўцёк, пакінуўшы тавар. «Спецыяліста» па крадзяжах з машын затрымалі.

## АПОШНЯЯ ЗАПІСКА АЎСТРАЛІЙЦА Ў МІНСКУ

**21-гадовы замежнік, які вучыўся на першым курсе медуніверсітэта, пакінуў перадсмяротную кароткую запіску, дзе развітваўся са сваяком.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» старшы памочнік пракурора горада Мінска Сяргей Балашоў, цела маладога грамадзяніна Аўстраліі, які жыў у інтэрнаце ВНУ на праспекце Дзяржынскага, знайшлі суседзі па пакоі і блоку каля васьмі гадзін вечара. Паводле папярэдніх звестак, напачатку хлопец спрабаваў звесці рахункі з жыццём у ванным пакоі, перарэзаўшы вены на руках, аднак пасля, магчыма, няўдалай спробы накінуў на шыю пятлю і павесіўся. Паводле звестак суседзяў аўстралійца, студэнт раней неаднаразова, калі знаходзіўся ў дэпрэсіі, выказваўся пра самагубства. Насамрэч, што стала прычынай адчайнага кроку, а таксама ўсе акалічнасці здарэння цяпер высвятляюць следчыя пракуратуры Маскоўскага раёна Мінска.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Сітуацыя

## Ці захаваецца каманда «Рытм»?

**Гэта пытанне абмяркоўвалася на сустрэчы старшыні Гродзенскага гарвыканкама Барыса Казялкова з кіраўніцтвам і спартсменкамі каманды па хакеі на траве «Рытм».**

Каманда сёлета аказалася практычна без фінансавання, і шэраг хакеістак напісалі заявы аб сыходзе, маючы намер перайсці ў іншыя клубы. Паводле слоў начальніка аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Гродзенскага гарвыканкама Уладзіміра Чыгірынава, сесіяй гарсавета выдзелены сродкі на ўтрыманне каманды, грошы ёсць, аднак іх... нельга выкарыстаць, не прапускае казначэйства. Праблема ў тым, што ў Бюджэтным кодэксе не прапісаныя расходы на ўтрыманне камандаў па гульнявых відах спорту. На сёння, зазначае Уладзімір Чыгірынаў, з абласнога бюджэту фінансаваць каманды можна, а з гарадскога — не. У выніку засталіся практычна без грошай тры гарадскія каманды.

— Чакаем змяненняў у Бюджэтным кодэксе і Указа аб замацаванні камандаў за прадпрыемствамі і арганізацыямі, — кажа Уладзімір Чыгірынаў. — Што датычыцца «Рытма», то задача — захаваць каманду.

Хутчэй за ўсё, сваё «плячо» ёй падставіць ААТ «Гродна-Азот».

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# ГУЛЬНЯ, ЯКУЮ ПРЫДУМАЎ БЕЛАРУС, ЗАВАЁЎВАЕ ЕЎРОПУ

**У «Схватку», правілы якой распрацаваў мінчук Іван Маслюкоў, гуляюць нават студэнты Сарбонскага ўніверсітэта і пераможцы «Еўрабачання».**


Іван Маслюкоў стварыў адну з самых папулярных экстрэмальных гульняў ХХІ стагоддзя.

Канадцы вынайшлі хакей, англічане — бокс, амерыканцы — бейсбол, а беларусы... прыгодніцка-інтэлектуальную гульню «Схватка». Здарылася гэта ў 2001 годзе ў Мінску. І напачатку ў яе гулялі не болей за два дзясяткі чалавек. Сёння — каля мільёна.

Наўрад ці нехта зможа назваць больш папулярную сацыяльную гульню, прыдуманую на еўрапейскім кантыненце ў ХХІ стагоддзі. Для многіх «Схватка» зрабілася стылем жыцця, спосабам дадаць рамантыкі ў сваё існаванне.

Сустракаюся са стваральнікам знакамітай гульні Іванам Маслюковым у адной з кавярняў на плошчы Перамогі ў Мінску. Распытваю, якім чынам яму ўдалося пакінуць свой крэатыўны след у гісторыі?

### «Мясцовыя жыхары ашалела глядзелі на людзей з ліхтарыкамі»

— Да таго, як прыдумаць «Схватку», я збіраў макулатуру і бутэлькі, прадаваў грушы на рынку. Адслужыў у войску разведчыкам, што пайшло мне на карысць: быў час падумаць, што я буду рабіць у жыцці. Калі ўзнікла ідэя наконт гульні, асэнсавання, што яна атрымае такую папулярнасць, не было. У 2001 годзе людзі ўжо хадзілі з ноўтбукамі, карысталіся інтэрнэтам праз свае манахромныя тэлефоны. У першай «Схватцы» ўдзельнічала восем камандаў, гэта каля 20 чалавек. Людзі атрымоўвалі заданні, насіліся па горадзе і выконвалі вар'яцкія місіі. Мэта місіі — знайсці код, які ўводзілі на сайце, пасля гэтага атрымоўвалі наступнае заданне. Так усю ноч ездзілі на аўтамабілях па горадзе, пакуль пераможца не выконваў апошняе і самае галоўнае заданне. За гады ў правілах амаль нічога не змянілася.

***— У якім раёне праходзіла першая гістарычная гульня?***

— Скончылася яна каля ТЭЦ-4, што ў сталічным мікрараёне Паўднёвы Захад. Там ёсць агромістыя ангары, якія былі на той час адчыненыя. У адным з ангараў мы распалілі вогнішча, народ туды падцягваўся. Усе гулялі першы раз і былі на ажыятажы. Мясцовыя жыхары ашалела глядзелі на людзей, якія з ліхтарыкамі выбягалі з машын, нешта шукалі. Выклікалі міліцыю, якая прыязджала, а нікога ўжо не было. Так гульні праходзяць і сёння. Толькі з часам яны зрабіліся больш заблытанымі, тэхніка пачала выкарыстоўвацца больш разнастайная.

***— Як людзі даведваліся пра першыя гульні?***

— Інфармацыя пра іх размяшчалася на разнастайных форумах, дзе тады сядзеў народ. Напрыклад, быў такі сайт «Мінскі слон», пра які сёння памятаюць толькі старажылы. Гулялі і гуляюць людзі, якім у жыцці мала вострых адчуванняў, якім хочацца разнастаіць сядзенне ў офісе нейкімі прыгодамі. Не проста паехаць кудысьці пакупацца, а каб быў «кіпеш». Такія людзі адчуваюць жыццё, калі адбываецца нешта экстрэмальнае.

> **Многім іншаземцам складана прывіць прагу прыгодаў, таму што тая ж Заходняя Еўропа куды больш латэнтная, спакойная, у іх ужо ўсё добра. Гэта людзі, якія нікуды не спяшаюцца, яны ездзяць 50 км/г па горадзе, яны ўсё паспелі.**

Асабіста я гуляў у 2002 годзе і потым яшчэ пару разоў. Гульня дапамагае пазбавіцца нейкіх комплексаў, жахаў, дапамагае адчуць, што ты можаш усё, чаго пажадаеш. Гэта і так ува мне ёсць. Таму я перастаў гуляць.

Звычайна людзі ўдзельнічаюць у «Схватцы» два, тры, чатыры гады, пасля сыходзяць. Але ёсць і такія, што прыйшлі і назаўсёды засталіся. Як у інстытуце, калі чалавек пасля сканчэння робіцца выкладчыкам і застаецца ў сістэме.

### «Гуляюць у «Схватку» і абарыгены — французы ці ангельцы»

***— «Схватка» набыла такую шалёную папулярнасць, што пачалі з'яўляцца шматлікія клоны гульні, прыдуманай вамі...***

— Клонаў столькі, што мы ўжо збіліся з падлікаў. Спачатку спрабавалі з гэтым змагацца, быў нават судовы працэс. Людзі зрабілі гульню па нашых правілах, толькі назвалі яе па-іншаму — «Паляванне». Мы падумалі-падумалі і вырашылі звярнуцца ў суд, бо гульню мы прыдумалі, а значыцца мы і павінны яе рабіць. Суд пастанавіў, што правілы гульні не з'яўляюцца аб'ектам аўтарскага права. Шахматы, напрыклад, ці хакей, прыдумляюць вельмі рэдка, таму на іх не выдаюць патэнты. Суд мы прайгралі.

***— Апроч «Схваткі» вы распрацавалі яшчэ шэраг гульняў, якія зноў жа сталі вядомымі...***

— Спачатку мы арганізоўвалі «Схватку» супольна з адным беларускім інтэрнэт-правайдарам. Пазней нашы думкі наконт развіцця праекта разышліся. Тады я зрабіў уласную міжнародную арганізацыю Encounter, якая пачала пашырацца ў іншых краінах. З'явіліся новыя гульні. У кожным рэгіёне маем свайго чалавека — менеджара. Беларусы — гэта толькі 5 працэнтаў ад усіх удзельнікаў арганізацыі. Людзі раз'язджаюцца па ўсім свеце і пачынаюць ладзіць гульні за мяжой. Пераважна гэта рускамоўныя ўдзельнікі. Але ёсць краіны, дзе гуляюць і мясцовыя жыхары — «абарыгены». Напрыклад, французы ці ангельцы. Але гэта выключэнне. Многім іншаземцам складана прывіць прагу прыгодаў, таму што тая ж Заходняя Еўропа куды больш латэнтная, спакойная, у іх ужо ўсё добра. Гэта людзі, якія нікуды не спяшаюцца, яны ездзяць 50 км/г па горадзе, яны ўсё паспелі.

Аднак і там нашы гульні развіваюцца. Апошнім разам нас запрасілі ў Сарбонскі ўніверсітэт Францыі, спецыяльна для арганізацыі гульні. Ім было цікава: прыехалі людзі з далёкай краіны, замуцілі дзвіжуху. У іх такога няма.

### «Здараюцца эксцэсы, калі пакладуць тварам у асфальт»

***— «Дзвіжуха» можа не спадабацца праваахоўнікам. Ці часта здараецца, каб удзельнікаў «Схваткі» затрымлівалі?***

— У Беларусі канфлікты здараюцца рэдка. Міліцыя прыязджае, ёй тлумачаць, што гэта спартыўнае мерапрыемства, арыентаванне па горадзе. Сёння, калі мы кажам «Схватка», пытанні звычайна адпадаюць. У Расіі бываюць эксцэсы. Хлопцы залезуць куды-небудзь з ліхтарыкамі, іх мянты павяжуць, тварамі аб асфальт і да высвятлення акалічнасцяў. У дадатак удзельнікі гульні могуць і ў навіны патрапіць. Гэта толькі дадае ім імпэту.


Так гуляюць у «Фотаэкстрым».

***— Вашу гульню часта «рэкламуюць» па тэлебачанні, асабліва ў Расіі...***

— Сюжэтаў шмат, таму што «Схватка» — сацыяльная з'ява. Але людзі, якія глядзяць тэлевізар, звычайна лайдакі. Пасля прагляду сюжэта яны могуць сказаць «крута!», але не палезуць на наш сайт рэгістравацца і знаёміцца з правіламі гульні. Таму сюжэты прыносяць нам мала карысці, вось калі б мы прадавалі пральны парашок, то я быў бы, напэўна, мільярдэрам.

***— Ці шмат вы зарабляеце з дапамогай Encounter? Ці можна лічыць ваш праект фінансава паспяховым?***

— Я не ўжываю слова «поспех», таму што разумею, наколькі яно абстрактнае. Мы зарабляем роўна столькі, каб існаваць і плаціць заробкі праграмістам. Я не зарабляю вар'яцкіх грошай. Вядома, я магу спыніць укладанні грошай і добра зарабляць. Але што я буду рабіць з грашыма? У слоік іх складваць? «Энкаунтэр» — гэта ідэалогія і псіхалогія. Гэта куды больш цікава, чым здабываць нафту альбо прадаваць шыны на рынку.

### «Тры ўдзельнікі праекта загінулі»

***— Ці здараліся падчас гульняў трагічныя выпадкі?***

— Гульня экстрэмальная. Няма ніводнага экстрэмальнага спорту, дзе не было б ахвяраў. Але ўсё проста: калі слухаць указанні арганізатара, то ніякіх ахвяраў не будзе. Арганізатары лепяць налепку «туды ісці нельга». Але знаходзяцца ўдзельнікі, якія ігнаруюць... За ўсю гісторыю на «Энкаўнтэры» загінулі тры чалавекі. У мінулым годзе ў Ліпецку два ўдзельнікі задыхнуліся ў калектары. Па гэтым калектары ўвесь горад перамяшчаўся, у ім трэба было прайсці адзін з узроўняў. Код знаходзіўся ў 50 метрах ад увахода. Далей арганізатар намаляваў стрэлку: «Выхаду няма». А двое хлопцаў думалі, што метраў праз трыста павінен быць яшчэ адзін выхад, і чамусьці вырашылі туды пайсці. Выхад быў завалены, там быў газ тыпу серавадароду. Яны задыхнуліся. Удзельнікі заўсёды падпісваюць паперку, што яны адказваюць за свае ўчынкі. Гульня экстрэмальная, трэба разумець, што гэта не забава ў пясочніцы. У нашай дакументальнай стужцы «Encounter. Жаданне жыць» распавядаецца пра трагічныя выпадкі.

***— Вы яшчэ і кіно здымаеце?***

— У планах зняць — прыгодніцкі серыял. Хутчэй за ўсё гэта будзе рабіцца ў Расіі. Вельмі шмат людзей лаяльна адносяцца да нашага брэнду і зацікаўленыя нешта ствараць супольна. У 2008 годзе ў Маскве выйшаў мой раман «Encounter: начны экстрым». Папросту надакучыла тлумачыць людзям, што такое «Схватка» і Encounter. Наклад быў невялікі — 7000 асобнікаў. Раман хутка раскупілі.

***— Вы дагэтуль жывяце ў Мінску?***

— Так, тут побач, на плошчы Перамогі. Тут усё проста, а ў Маскве жыць складана. Аднак працаваць лепш у Расіі.

### Гульнямі Encounter цікавіцца Руслана

Правілы, прыдуманыя ў Мінску, прыйшліся даспадобы такой вялікай колькасці людзей, што ў іх лік патрапілі знакамітасці.

— Дакладна ведаю, што ў нашых фотагульнях прымаюць удзел вядомы расійскі дызайнер Арцемій Лебедзеў, да гульняў мелі дачыненне салістка «Начных снайпераў» Дзіяна Арбеніна, пераможца «Еўрабачання» Руслана і іншыя.

Паводле статыстыкі сайта en.cx, сёння ў гульнях праекта Encounter задзейнічана каля 20 тысяч камандаў (150 тысяч удзельнікаў) з прыкладна 300 гарадоў 24 краін свету. Клонамі народжанай у Беларусі гульні цікавяцца ўжо каля мільёна чалавек.

Праект Encounter прапаноўвае шэсць арыгінальных гульняў. Гэта, вядома, «Схватка», «Фотаэкстрым» (удзельнікі павінны сфатаграфаваць нейкі востры момант, напрыклад, аголеную дзяўчыну, якая ляжыць у ваннай, што выстаўлена на аўтобусным прыпынку), «Фотапаляванне», «Кэшынг» (удзельнікі шукаюць тайнікі па GPS каар дынатах), «Мокрыя войны» (па інтэрнэце ўдзельнікі атрымоўваюць «асабістыя справы» сваіх канкурэнтаў і «замочваюць» адно аднаго з вадзяных пісталетаў), «Мазгавы штурм» (інтэлектуальная гульня).

Найлепшыя гульцы час ад часу атрымоўваюць узнагароды, напрыклад, Залаты Ордэн 1 ступені «Зялёная Зорка».

**Яўген ВАЛОШЫН.**

**31 марта 2010 года в 15.00 (регистрация с 14.30) по адресу: г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, 143 (актовый зал) состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «МОЛОДЕЧНОПИВО»**

**Повестка дня:**

1. О финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Молодечнопиво» в 2009 г. и основных направлениях развития в 2010 г.
2. О результатах аудиторской проверки и отчет Ревизионной комиссии о финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 г.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса ОАО «Молодечнопиво» за 2009 г.
4. Избрание членов Наблюдательного совета.
5. Избрание членов Ревизионной комиссии.
6. Об утверждении регламента работы ОАО «Молодечнопиво» с реестром владельцев ценных бумаг.

При себе иметь: акционеру Общества — паспорт, а представителю акционера — паспорт и доверенность.

**Наблюдательный совет.**

УНП 600042292 **Тел. (8 0176) 77 06 17.**

**ОАО «МИНСКИЙ ПРИБОРОСТРОИТЕЛЬНЫЙ ЗАВОД» СООБЩАЕТ:**

**30 марта 2010 года** в 14.00 в зале заседаний корпуса № 30 по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 58 состоится очередное собрание акционеров и их представителей.

**Повестка дня:**

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2010 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2009 году.
3. О результатах аудита и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2009 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли и расходов на потребление, выплате дивидендов за 2009 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2010 год.
7. Об утверждении изменений в Устав Общества.
8. О внесении исправлений в документы Единого государственного регистра недвижимого имущества и о передаче помещений гражданской обороны в коммунальную собственность г. Минска.
9. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
10. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Регистрация участников собрания — с 13 до 14 часов при предъявлении паспорта. Акционер ОАО «Минский приборостроительный завод» принимает участие в работе собрания лично или через своих представителей, действующих на основании доверенности.

**Наблюдательный совет.**

УНП 100363840.

